Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 СТУДЗЕНЯ 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 2
(26360)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 6

Аб прысуджэнні прэміі «За духоўнае адраджэнне» 2008 года

Разгледзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры, савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, узгодненыя з кіраўніцтвам Беларускай праваслаўнай царквы, **пастанаўляю:**

1. За актыўную падзвіжніцкую дзейнасць у гуманітарнай галіне, накіраваную на развіццё прагрэсіўных мастацка-маральных традыцый, што садзейнічаюць усталяванню духоўных каштоўнасцяў, ідэй дружбы і братэрства паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, **прысудзіць прэмію «За духоўнае адраджэнне» 2008 года:**

аўтарскаму калектыву дзесяцітомнага выдання «Беларусы» дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» ў складзе Бялявінай Валянціны Мікалаеўны, старшага навуковага супрацоўніка аддзела народнай культуры і мастацтва, кандыдата гістарычных навук, Гурко Аляксандры Уладзіміраўны, загадчыка аддзела народнай культуры і мастацтва, доктара гістарычных навук, Каспяровіч Галіны Іванаўны, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела народнай культуры і мастацтва, доктара гістарычных навук, Кухаронак Таццяны Іванаўны, старшага навуковага супрацоўніка аддзела народнай культуры і мастацтва, кандыдата гістарычных навук, Лакоткі Аляксандра Іванавіча, дырэктара інстытута, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Ракавай Любові Васільеўны, дактаранта аддзела народнай культуры і мастацтва, кандыдата гістарычных навук, Сахуты Яўгена Міхайлавіча, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, доктара мастацтвазнаўства, Чаквіна Ігара Усеваладавіча, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела народнай культуры і мастацтва, доктара гістарычных навук;

калектыву дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі»;

прыёмнай сям'і Онахавых Кацярыны Мечыславаўны і Аляксандра Васільевіча;

Шырытону Аляксандру Мікалаевічу протаіерэю, настаяцелю рэлігійнай абшчыны «Прыход храма прападобнага Серафіма Сароўскага ў г. Мінску Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы».

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій «За духоўнае адраджэнне» са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асобаў.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

8 студзеня 2009 г., г. Мінск.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 7

Аб прысуджэнні спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2008 года

Разгледзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры і савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, **пастанаўляю:**

1. За значныя вынікі ў творчай, культурна-асветніцкай, навуковай, педагагічнай дзейнасці, якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2008 года ў наступных намінацыях:

МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА

Мдзівані Андрэю Юр'евічу, прафесару кафедры кампазіцыі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», заслужанаму дзеячу мастацтваў Рэспублікі Беларусь, — за значны асабісты ўклад у развіццё беларускага музычнага мастацтва і стварэнне оперы-прытчы «Маленькі прынц»;

ТЭАТРАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА

Аўсяннікаву Генадзю Сцяпанавічу, вядучаму майстру сцэны дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы», народнаму артысту СССР, — за яркія сцэнічныя вобразы ў спектаклях тэатральнага сезона 2007/2008 года;

МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА

Шніпу Віктару Анатольевічу, галоўнаму рэдактару выдавецкага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мастацкая літаратура», — за выдатныя творчыя дасягненні, стварэнне кнігі паэзіі і прозы «Страла кахання, любові крыж»;

НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Іванаўскай школе бондарства — за значны ўклад у зберажэнне і папулярызацыю старадаўніх народных рамёстваў;

Харкевічу Аляксандру Антонавічу, майстру дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (в. Ваўканосава Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці), — за стварэнне самабытных мастацкіх твораў, актыўны ўдзел у выстаўках, конкурсах і фестывалях;

ХАРЭАГРАФІЧНАЕ МАСТАЦТВА

Гайко Вользе Уладзіміраўне, артыстцы балета, вядучаму майстру сцэны дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь», заслужанай артыстцы Рэспублікі Беларусь, — за яркія сцэнічныя вобразы, створаныя ў спектаклях тэатральнага сезона 2007/2008 года;

КРЫТЫКА І МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА

Шаранговіч Наталлі Васільеўне, рэдактару аддзела выяўленчага мастацтва рэдакцыйна-выдавецкай установы «Культура і мастацтва», — за значны асабісты ўклад у даследаванне і папулярызацыю сучаснага беларускага выяўленчага мастацтва;

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА

калектыву ўстановы «Веткаўскі музей народнай творчасці» — за плённую працу па захаванні і прапагандзе гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

калектыву дзяржаўнай установы культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага» — за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне і арганізацыю бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва;

АМАТАРСКАЯ МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь студыі сучаснага бальнага танца «Мара» культурна-забаўляльнага рэспубліканскага даччынага ўнітарнага прадпрыемства «Культсэрвіс» Мінскага трактарнага завода — за выдатныя творчыя дасягненні і значны ўклад у эстэтычнае выхаванне моладзі;

народнаму фальклорнаму калектыву «Гасцінец» Ракаўскага Цэнтра культуры і вольнага часу — за значную працу па вывучэнні, захаванні і прапагандзе песеннай спадчыны, звычаяў і традыцый беларусаў;

ВЫХАВАННЕ ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ

Дзяржынскай дзіцячай школе мастацтваў — за плённую культурна-асветніцкую і педагагічную дзейнасць, падрыхтоўку лаўрэатаў міжнародных фестываляў і конкурсаў.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2008 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асобаў.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

8 студзеня 2009 г., г. Мінск.

КАЛЯДНЫ СТАРТ

Фота Анатоля КЛЕШНЮКА.

Жыхары Лепеля Дзмітрый КЛІМАНСКІ і Таццяна ГОЛЬДЗІНА спяшаюцца на раённае калядное прадстаўленне.

«УЗРОСТАВАЯ ПЛАНКА» — БЕЗ ЗРУХАЎ

Дэвальвацыя беларускага рубля плюс павышэнне жыллёва-камунальных тарыфаў — такім стаў самы пачатак 2009 года. Што да прагнозаў, то не сакрэт: далейшае развіццё падзей шмат у чым будзе залежаць ад айчыннай і сусветнай эканомік. У сувязі з гэтым, зазначыла падчас сустрэчы з журналістамі першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА, сёння ёсць сэнс рабіць стаўку не на доўгатэрміновыя, а на кароткатэрміновыя сацыяльныя праграмы і вызначаць іх з улікам усіх магчымых варыянтаў змены сітуацыі. Разам з тым, у міністэрстве адзначаюць: намераў нават паступова згортваць сацыяльную палітыку дзяржавы няма.

У НОВЫ ГОД БЕЗ ДАЎГОЎ ПА ЗАРПЛАЦЕ

Калі ў студзені-лістападзе 2000 года сярэдняя зарплата па Беларусі складала 73,6, 2003 года — 120,8, то 2008 года — 443,6 долара ў эквіваленце. Гэта прывяло да паступовага скарачэння колькасці малазабяспечанага насельніцтва. У студзені-верасні летась даходы ніжэй за адзнаку бюджэту пражыткоўага мінімуму мелі 6,2 працэнта грамадзян краіны — на 1,4 менш, чым за аналагічны перыяд 2007 года.

Паводле слоў Марыяны Шчоткінай, апошнім часам дзяржава праводзіла актыўную палітыку па рэгуляванні ўзроўню аплаты працы. Вынікаў некалькі. У краіне вызначаны і вытрымліваецца новы стандарт па мінімальнай зарплаце — з 1 студзеня яе памер складае 229 700 рублёў. Дзякуючы рэгуляванню не адбылося значнага «разрыву» даходаў, суадносіны паміж рэсурсамі 10 працэнтаў найменш і найбольш забяспечанага насельніцтва сёння не перавышаюць 5-6 разоў. Нарэшце, не назіраецца значнай розніцы ў заробках па рэгіёнах: з улікам горада Мінска гэта розніца складае 1,52, а без уліку сталіцы — 1,1 раза. Але вось што галоўнае. Як падкрэсліла першы намеснік міністра, насуперак скептычным меркаванням, Беларусь распачала новы год без пратэрмінаваных запазычанасцяў па зарплаце.

Тым часам ці не галоўнае пытанне — што будзе з заробкамі надалей, у прыватнасці, пасля дэнамінацыі беларускага рубля, пра магчымасць якой сёння гаворыцца?

— Наіўна было б чакаць, што мы застанёмся ў баку ад таго, што адбываецца ў свеце, — зазначыла Марыяна Шчоткіна. — Прычым рабіць якія-небудзь прагнозы наконт стабілізацыі сусветнай эканомікі пакуль немагчыма, адпаведна, цяжка называць канкрэтныя лічбы і даты павелічэння зарплаты. Аднак трэба падкрэсліць: **задачы праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, і ў тым ліку наконт заробкаў, у цэлым на «пяцігодку» ніхто не адмяняў.**

ЛАКАЎТЫ СЁННЯ НЕ ПЛАНУЮЦЦА

Стварэнне больш чым 150 тыс. новых працоўных месцаў, прафесійнае перанавучанне 22 тыс. беспрацоўных, аказанне грашовай дапамогі на пачатак уласнай справы 2,5 тыс. чалавек, падтрымка 325 сем'ям на перасяленне на новае месца жыхарства і працы. Такім чынам, паведаміў **намеснік міністра Пётр ГРУШНІК,** на сёння ў краіне налічвалася 37,4 тыс. беспрацоўных, прычым службы занятасці маюць зместкі больш чым аб 60 тыс. вакансій.

— У параўнанні з 2007 годам колькасць зваротаў у службы занятасці крыху павялічылася, аднак рост прыкладна на 6 працэнтаў крытычным назваць нельга. У цэлым жа планы застаюцца ранейшымі: у канцы 2009 года ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя не павінен перавысіць 1,1-1,2, а ў канцы 2010 года — 1-1,1 працэнта, — падкрэсліў Пётр Грушнік. — Сапраўды, сітуацыя неадназначная, прадпрыемствам, зарыентаваным на экспарт, сёння цяжка. Тым не менш нагадаю: паводле заканадаўства, суб'екты гаспадарання, якія плануюць скарачэнне, абавязаны за доўгі час да звальненняў паведаміць аб іх у службы занятасці. Аднак пакуль падобных паведамленняў мы не атрымлівалі.

ПАДТРЫМКА БЕСПРАЦОЎНЫМ У ЗВЯЗЦЫ З БПМ?

Асобная і таксама няпростая тэма — працоўныя рэсурсы. У параўнанні з 2007 годам колькасць грамадзян, занятых у айчыннай эканоміцы, павялічылася на 42,1 тысячы чалавек. Адпаведна ў лістападзе летась афіцыйны занятак мелі больш як 4 млн 530 тыс. беларусаў. І, як чакаецца, напрыканцы 2009 года паказчык узрасце да 4 млн 650 тыс., а напрыканцы 2010 года — да 4 млн 775 тыс. чалавек.

Магчымасці павелічэння працоўных рэсурсаў вядомыя. Прыкладам, гаворка аб уладкаванні інвалідаў, працаваць якім не забараняюць медыкі, ці вяртанні за радзіму беларускіх гастарбайтараў — перш-наперш будаўнікоў і вадзіцеляў з Расіі. Але ў той жа час застаюцца іншыя «рэзервы» — грамадзяне краіны, якія не маюць сталага афіцыйнага занятку. Прычым не сакрэт: нежаданне звяртацца ў службу занятасці апошніх не ў апошнюю чаргу тлумачыцца... невялікімі дапамогамі па беспрацоўі. Сёння іх сярэдні памер складае каля 41 тыс. рублёў.

— Мы ведаем гэту праблему і лічым, што яе насамрэч трэба вырашаць, — зазначыў Пётр Грушнік. — Цяпер дапамогі па беспрацоўі «прывязаныя» да базавай велічыні, тады як больш правільна было б выходзіць з бюджэту пражыткоўага мінімуму. Так, гэта запатрабуе змянення заканадаўства, тым не менш такі крок падаецца цалкам лагічным.

ДАПАМОГА НАБЯРЭ ВАГУ

Як сведчыць статыстыка, апошнім часам тэмпы скарачэння насельніцтва Беларусі замаруджваюцца. У 2006 годзе нас стала менш амаль на 50 тыс., пазалетась — на 29,4 тыс., а за студзень-лістапад летась — на 23,4 тысячы. І ці не галоўнай прычынай паляпшэння стала павелічэнне нараджальнасці. У студзені-лістападзе летась у краіне з'явілася 98 810 немаўлят — гэта на 3,7 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд 2007 года. Дарэчы, рост колькасці нараджэнняў адзначаўся ва ўсіх рэгіёнах без выключэння. Аднак найбольшым ён быў у сталіцы (6,2), Гомельскай (4,7) і Гродзенскай абласцях (4,6 працэнта).

Як заўважыў Пётр Грушнік, не ў апошнюю чаргу павышэнне нараджальнасці сталася вынікам дадатковых мераў сацыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі. Але, на жаль, казаць аб кардынальным змяненні сітуацыі пакуль не выпадае. У сярэднім на 1 жанчыну прыпадае 1,373 дзіцяці — гэтага недастаткова нават для простага аднаўлення насельніцтва. Таму стымуляванне нараджальнасці працягнецца. Як паведаміў намеснік міністра, **памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў павінен зраўняцца з бюджэтам пражыткоўага мінімуму. Праект адпаведнага рашэння ўжо падрыхтаваны і будзе разглядацца сёлета.**

ЧЭРГІ ЁСЦЬ. ІМ БЫЦЬ НЯДОЎГА

Павелічэнне колькасці грамадзян, якія абслугоўваюць сацыяльныя работнікі дома, а таксама адкрыццё ў шэрагу рэгіёнаў аддзяленняў кругласутачнага знаходжання для пажылых грамадзян зрабілі сваю справу — у Беларусі не засталося чаргі ў дамы-інтэрнаты агульнага тыпу. Аднак іншы малюнак назіраецца з інтэрнатамі для псіханеўралагічных хворых. Рэальна тут не хапае каля тысячы месцаў. Прычым найбольш цяжкая сітуацыя склалася ў сталіцы. Праўда, як паведаміў **намеснік міністра Валяр'ян КАРОЛЬ,** у найбліжэйшы час гэта праблема павінна вырашыцца. У прыватнасці, праграма аптымізацыі і развіцця сеткі ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання вызначае, што **ў выніку рэканструкцыі і пашырэння дамоў-інтэрнатаў чэргі для псіханеўралагічных хворых знікнуць у наступным годзе.**

(Заканчэнне на 4-й стар.)

У Мінску рэкорд па жыллі

У 2008 годзе ў Мінску пабудавана рэкордная колькасць жылля — 1 мільён 140 тысяч квадратных метраў, што складае прыкладна 170 жылых дамоў.

Сёлета плануецца ўзвесці не менш як 1 мільён 400 тысяч квадратных метраў жылля. Аб гэтым паведаміў старшыня Камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Андрэй Ясючэня. Паводле яго слоў, такой колькасці жылля ў беларускай сталіцы не будавалася нават у часы Савецкага Саюза. Кажучы пра кошт квадратнага метра жылой плошчы для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, сузразмоўца адзначыў, што ў 2008 годзе ён склаў каля 680—710 долараў, у гэтым годзе не павінен перавысіць 800 долараў за адзін квадратны метр.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

Моцны снег, а ў нядзелю — да мінус 20

Гэтымі днямі праз тэрыторыю Беларусі будзе рухацца актыўны атмасферны фронт, таму ў пятніцу паўсюдна чакаецца снег і мяцеліца, па Віцебскай і Магілёўскай абласцях месцамі моцны снег, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў. У пятніцу і суботу чакаецца ўзмацненне заходняга ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ў пятніцу ад мінус 6 да плюс 1 градуса. Уначы 10 студзеня паўсюдна, а ўдзень па Гомельскай і Магілёўскай абласцях чакаецца кароткачасовы снег. У суботу тэмпература паветра на працягу сутак 2—9 марозу, уначы па поўначы да мінус 14 градусаў. У нядзелю да нас завітае антыцыклон і ападкаў ужо не будзе. Уначы і раніцай туман і намаразь. Тэмпература ўначы 5—12, пры праясненнях да 15—20 марозу, удзень ад 0 да мінус 6 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

По поручению ОАО «Белэнергострой» КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже цеха спецметаллоконструкций, об. пл. 7 204,4 кв.м и бетонированной площадки цеха спецметаллоконструкций, об. пл. 4882,0 кв.м, расположенных по адресу: Пуховичский район, г.п. Свислочь, промплощадка Минской ТЭЦ-5 (имеется ж/д ветка). Начальная цена с НДС – 3 000 000 000 бел. рублей. Задаток в сумме 100 000 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объекты производится в следующем порядке: 50 % стоимости объектов оплачивается в течение 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи, оставшиеся 50 % оплачивается в течение 60 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Земельный участок для обслуживания объекта будет выделен из земельного участка об. пл. 49,14 га, находящегося в постоянном пользовании ОАО «Белэнергострой». Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **10.02.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.02.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» **с 1 января 2009 года**

ПОВЫШАЕТ ПРОЦЕНТНЫЕ СТАВКИ ПО СРОЧНЫМ БАНКОВСКИМ ВКЛАДАМ (ДЕПОЗИТАМ) В БЕЛОРУССКИХ РУБЛЯХ И УСТАНАВЛИВАЕТ ИХ В СЛЕДУЮЩИХ РАЗМЕРАХ:

- **«Премиально-накопительный «Детский»** – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 5,5 процента годовых, с учетом дополнительного дохода полная процентная ставка – **22** процента годовых;
- **«Мобильный»** – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 5 процентов годовых, с учетом дополнительного дохода полная процентная ставка – **21** процент годовых;
- **«Особый»** – 18 процентов годовых, с учетом дополнительного дохода полная процентная ставка – **20** процентов годовых;
- **«Накопительный»** – 19 процентов годовых, с учетом дополнительного дохода полная процентная ставка – **21** процент годовых;
- **«XXI век» на 370 дней** – 18 процентов годовых, с учетом дополнительного дохода полная процентная ставка – **20** процентов годовых;
- **«Престиж»** – **20** процентов годовых;
- **«Гарантированный доход»** – **18** процентов годовых;
- **«Пенсионный»** – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, **14** процентов годовых.
- **«Юбиляр»** – дополнительный доход, выплачиваемый в соответствии с Условиями вклада – 3,5 процента годовых, полная процентная ставка – **21** процент годовых.

Установленный размер дохода применяется с 01.01.2009 г. как по вновь принимаемым, так и по ранее принятым банковским вкладам (депозитам), на основании договоров, действующих на день первого официального опубликования настоящего решения в средствах массовой информации.

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» также информирует, что **с 9 января 2009 года**

ПОВЫШАЕТСЯ ПРОЦЕНТНАЯ СТАВКА ПО СБЕРЕГАТЕЛЬНЫМ СЕРТИФИКАТАМ ОАО «АСБ БЕЛАРУСБАНК» ДО 20 ПРОЦЕНТОВ ГОДОВЫХ.

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении банка или на сайте

http://www.belarusbank.by

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2008 г., млн. белорусских рублей.

	январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2008 г.
Вклады до востребования	5,6	43,8	67,5	110,0	128,9	141,0	497,5	516,8	301,4	676,7	522,2	31729,2	34740,6
в том числе: в белорусских рублях	5,0	42,2	65,0	105,8	125,4	135,2	491,2	506,5	290,5	660,8	510,2	31627,1	34564,9
в иностранной валюте	0,6	1,6	2,5	4,2	3,5	5,8	6,3	10,3	10,9	15,9	12,0	102,1	175,7
Срочные депозиты	8577,5	10960,6	14850,6	10096,0	40533,6	64733,2	53206,9	45772,1	71982,2	57766,9	48722,4	85754,2	512956,2
в том числе: в белорусских рублях	8326,4	10439,5	10302,9	9800,2	30827,4	49986,5	42431,2	34762,4	57053,7	46908,0	37328,7	59971,3	398138,2
в иностранной валюте	251,1	521,1	4547,7	295,8	9706,2	14746,7	10775,7	11009,7	14928,5	10858,9	11393,7	25782,9	114818,0

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

белагропромбанк

традиции будущего

С 08 января 2009 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 31.12.2008 № 215 размер ставки рефинансирования установлен в размере 14 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада ***«Универсальный»***, заключенных в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и ***«Сберегательный»***, заключенных в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на **2,0 процентных пункта** с 09.01.2009 г.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Падпіска-2009

«Звяздоўскім» прызам — шырокую геаграфію

Учора ў сценах рэдакцыі прайшоў розыгрыш прызоў па выніках падпіскі на 1-е паўгоддзе 2009 года. Вяршыцелямі лёсаў нашых чытачоў, якія прысылалі ў рэдакцыю запоўненыя купоны (каля 2 тысяч) па традыцыі сталі нашы госці. На гэты раз халадзільнік «Атлант», сем каляровых тэлевізараў «Віцязь», а таксама больш дробныя прызы знайшлі сваіх гаспадароў з лёгкай рукі намесніка начальніка аддзела паштовай сувязі Міністэрства сувязі і інфармацыі РБ Раісы Жыгалкі, нашай падпісчыцы з Мінска Алены Багданавай і начальніка ўпраўлення распаўсюджвання друку РУП «Белпошта» Марыі Вараб'ёвай (на здымку злева направа). Падрабязнасці розыгрышу і спіс пераможцаў будуць надрукаваны ў наступным нумары газеты. Мы зазначым, што ўвесь прызавы фонд мае шырокую геаграфію па ўсіх рэгіёнах краіны.

Кар. «Звязды».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.01.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 645,00
1 еўра	3 581,33
1 латвійскі лат	5 075,80
1 літоўскі літ	1 039,15
1 чэшская крона	136,88
1 польскі злоты	889,49
1 расійскі рубель	90,16
1 украінская грыўня	316,77

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	29,3916
10 UAH	38,2952
1000 BYR	13,3537
EUR	41,4275

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ISSN 1990 - 763X

НЕ ДАЛА СЯБЕ ЎКРАСЦІ

Ноччу трое беспрацоўных з в. Яечкавічы Іванаўскага раёна зазірнулі на свінакомплекс «Баравіца» і паспрабавалі ўкрасці свінню. Але тая ціха памяраць не захацела і ўзняла візгат. Зладзеяў затрымалі і пасадзілі ў ізалятар. Цяпер ім не да кумпячка.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Праваслаўным хрысціянам Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Ражджаством Хрыстовым.

Мы сустракаем гэта цудоўнае свята з любоўю, надзеяй і ўпэўненасцю ў тым, што разам нам пад сілу пераадолець усе цяжкасці і выпрабаванні.

Гэта ўрачыстасць прыносіць вялікую радасць мільёнам праваслаўных хрысціян, вучыць жыць у адзінстве, міры і згодзе, нязменна прытрымлівацца маральных запаведзяў і дзейнічаць па законах праўды і гуманізму.

Ражджаство — час душэўнага спакою, ціхіх роздумаў і добрых спраў. І таму, прыходзячы ў храм або сабраўшыся ў сямейным коле каля ўпрыгожанай ёлкі, давайце забудзем пра сваркі, папросім прабачэння ў сваіх блізкіх, сяброў і калег за вольныя і міжвольныя крыўды, адкрыем сэрцы для ўсяго чыстага, добрага і цудоўнага.

Няхай цеплыня калядных дзён сагравае вас увесь год, дорыць бадзёрасць духу і стваральную энергію для працы ў імя працвітання Айчыны.

Моцнага здароўя, поспехаў, шчасця і дабрабыту вам, дарагія сябры!

З Ражджаством Хрыстовым!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ З ГОДНАСЦЮ ВЫТРЫМАЕ ВЫПРАБАВАННІ І ВЫКЛІКІ ЦЯПЕРАШНЯГА ТРЫВОЖНАГА ЧАСУ»

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 7 студзеня па існуючай традыцыі прыняў удзел у Калядным богаслужэнні ў Свята-Духавым кафедральным саборы ў Мінску.

Выступаючы на богаслужэнні, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што свята Ражджаства Хрыстовага нясе святло вялікай веры і накіроўвае людзей да спрадвечных духоўных каштоўнасцяў гуманізму і маральнай чысціні.

«Гэта свята мы сустракаем з надзеяй на тое, што народ Беларусі, як і раней, абмінуць беды і ўзрушэнні, што мы з гонарам і годнасцю вытрымаем усе выпрабаванні і новыя выклікі цяперашняга трывожнага часу», — сказаў Прэзідэнт.

Мінулы год быў адзначаны важнымі падзеямі ў духоўным жыцці беларускага народа. Праваслаўны свет шырока адзначаў 1020-годдзе Хрышчэння Русі. «Урачыстасці, што прайшлі ў розных краінах, яшчэ раз паказалі, наколькі важныя адзінства і згода нашай царквы і нашага народа, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Нам вельмі пашанцавала, што ў гэтыя гістарычныя дні з намі быў Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II. На вялікі жаль, яго сустрэча з беларускім народам была апошняй. Ад нас пайшоў сапраўдны сябар і настаўнік, які шчыра любіў нашу краіну, выдатны пастыр, які са шчырай дабрынёй ставіўся да Беларусі, супераджываў нашым праблемам, радаваўся поспехам. Няхай развітальнае благаслаўленне Патрыярха паслужыць нам надзейнай духоўнай апорай у сучасным свеце, дзе яшчэ нярэдка бяруцца пад сумненне або, што яшчэ горш, абсмейваюцца традыцыйныя маральныя каштоўнасці».

Праваслаўная царква спакон веку гаворыць пра маральны абавязак чалавека, заклікаючы да брацкай любові і ўзаемапавагі, процістаіць людскому недаверу, абыякавасці і нігілізму. «Дык давайце ж думаць і дзейнічаць так, як вучаць нас хрысціянскія каштоўнасці», — заклікаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі многае робіцца для таго, каб наша дзяржава квітнела. Гэты год аб'яўлены ў рэспубліцы Годам роднай зямлі, і «мы павінны ўзмацніць свае дзеянні для таго, каб яшчэ больш прыгожай зрабіць нашу Беларусь і пераўтварыць нашу зямлю». Паводле слоў Прэзідэнта, гэта толькі пачатак вялікага шляху. «А ў канцы яго мы, наша пакаленне, павінны завяршыць гэту місію і перадаць гэты цудоўны куток планеты нашым дзецям, каб яны тут маглі спакойна жыць, зарабляць, каб утрымліваць сям'ю, і галоўнае, радавацца сваёй зямлі. Наша зямля павінна быць самай прыгожай на планеце. Бог нам для гэтага зрабіў усё, толькі нам цяпер трэба прыкласці намаганні, каб гэта падтрымліваць і развіваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Царква заўсёды была побач з народам. «Яна была і ёсць неад'емная частка ўсяго грамадства. Няма той праблемы, да якой бы царква не прычынялася», — адзначыў Прэзідэнт. Ён падзякаваў кіраўніцтву і прадстаўнікам Царквы за тую вялікую місію, якую яны нясуць у дзяржаве, прасвятляючы, духоўна адраджаючы тыя каштоўнасці, якія былі моцна прызабыты апошнім часам.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што сёння вельмі шмат гаворыцца аб праблемах і цяжкасцях. «Так, я адкрыта і сумленна сказаў яшчэ ў мінулым годзе, што гэты год будзе няпросты. Але калі мы яго дастойна пераадолеем, мы будзем значна больш моцныя, чым цяпер. І мы робім усё для таго, каб негатыўныя тэндэнцыі, якія, на жаль, прадаўжаюць развівацца ў свеце, спароджаныя не на нашай зямлі, як мага хутчэй мінулі, не закранулі нашых людзей, нашага народа. Мы многае зрабілі (я маю на ўвазе кіраўніцтва краіны, улады), і цяпер усё залежыць ад людзей, ад народа. Мы не будзем вам хлусіць, і я перш за ўсё. Мы будзем гаварыць і горкую праўду, нават калі яна горкая, будзем яе гаварыць. Мы будзем вас прасіць зрабіць так, а не інакш. Калі ласка, зрабіце так, як я вас буду прасіць. Калі нас будуць чакаць нейкія складаныя часы, мы таксама вам аб гэтым скажам. Але пакуль сітуацыя складваецца так, што панікі быць не павінна. Нават нягледзячы на тое, што ўвесь свет фактычна спыніўся, сёння нават японскае аўтамабілебудаванне спынілася, нам удаецца яшчэ неяк трымацца — тую палавіну года, пачатак гэтага года. Кожны чалавек павінен думаць пра сябе, пра сваю сям'ю, гэта перш за ўсё, гэта галоўны клопат. Але гэта ж не так шмат, так было заўсёды. Усё астатняе павінна вырашацца кіраўніцтва прадпрыемстваў, раёнаў, гарадоў, урад. На гэта я арыентую нашы ўлады. Я думаю, што ў гэтыя складаныя часы Царква падставіць сваё плячо, будзе побач і будзе адкрыта і сумленна падказваць або паказваць на тыя памылкі, якія, магчыма, дапускаюцца ў нашым грамадстве», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў: «Перабольшваць тое, аб чым я гавару, нельга, ні ў якім разе. Але яшчэ горш будзе, калі мы не будзем звяртаць увагу на гэта. Нямала лепш мы будзем настройвацца на горшы варыянт, а лепшы — ён заўсёды будзе лепшым. Таму я хачу ў пачатку гэтага года ў светлае свята Раджаства Хрыстовага пажадаць вам стойкасці. Я думаю, што Бог не пакіне і на гэты раз нашу краіну, нашу дзяржаву, нашых людзей. Прынамсі, апошнія гады навейшай гісторыі ён заўсёды нас падтрымліваў, і мы з гонарам выходзілі з усіх цяжкіх момантаў, якія прыходзілі да нас на нашу зямлю».

«Мы поўныя рашучасці зрабіць нашу зямлю, наш агульны дом яшчэ больш прыгожым», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Як бачыце, мы не адмяняем ніякіх праграм, мы будзем дзейнічаць напружана і ні ў якім разе не павінны апусціць рукі, як гэта робіцца ў іншых дзяржавах, спасылаючыся на нейкі крызіс. Крызісу ў краіне няма. Усё залежыць ад нас. І мы зробім усё для таго, каб мы былі моцнымі і багатымі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І няхай гэты і наступныя гады прынясуць у вашы сем'і толькі мір і шчасце. Дык няхай беражэ Бог Беларусь, наш народ ад усялякага зла».

Прэзідэнт перадаў у дар Беларускай праваслаўнай царкве ікону Божай Маці «Вастрабрамская».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МІНСК ВЯРТАЕ ДАПАМОГУ ХВОРЫМ ДЗЕЦЯМ

Вызначаныя мерапрыемствы па выдзяленні сацыяльнай дапамогі асобным катэгорыям насельніцтва горада Мінска на 2009 год. У прыватнасці, у найбуйнейшым горадзе краіны плануецца аказанне дадатковай падтрымкі некаторым пенсіянерам, інвалідам, сем'ям з няпоўнагадовымі дзяцьмі і шматдзетным сем'ям. Пры гэтым варта заўважыць: у параўнанні з папярэднімі падобнымі праграмамі сёлета найменш абароненых жыхароў сталіцы чакаюць некаторыя новаўвядзенні.

Доўгажыхар з прыбаўкай

Самы высокі ўзровень пенсій — толькі адзін бок медаля. Адначасова нельга не прызнаць, што ў адрозненне ад жыхароў іншых рэгіёнаў, мінчане ў паважным узросце плацяць больш за камунальныя паслугі. А ў дадатак да таго, значная частка сталічных пенсіянераў фактычна пазбаўлена магчымасці карыстацца такой крыніцай даходаў, як прысядзібныя гаспадаркі. Уласна кажучы, гэтым і тлумачыцца рашэнне аб дадатковай падтрымцы.

Як і раней, сёлета захаваецца права на штомесячныя даплаты ў памеры мінімальнай пенсіі па ўзросце да дапамог непрацуючым мінчанам, што дагледжваюць за 80-гадовымі грамадзянамі ці інвалідамі I групы. Гэткая ж дадатковая выплата прадугледжана і непрацуючым маці вайскоўцаў, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў.

Сем'ям вайскоўцаў, што загінулі пры выкананні службовых абавязкаў, плануецца выдзяліць аднаразовую грашовую дапамогу на набыццё кветак і наведанне месцаў пахавання — звычайна такая дапамога прымяркоўваецца да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. А пенсіянеры, якія з'яўляюцца Героямі Беларусі ці СССР, Героямі Сацыялістычнай працы, поўнымі кавалерамі ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы, інвалідамі і ўдзельнікамі вайны, могуць разлічваць на аплату за кошт гарадскога бюджэту курса медыка-псіхалагічнай рэабілітацыі па праграме дабрачыннага фонду «Элеас» Мінскай епархіі праваслаўнай царквы.

Мінчанам-доўгажыхарам (ва ўзросце ад 95 гадоў і больш) сёлета будзе рабіцца дадатковая штомесячная выплата ў памеры мінімальнай пенсіі па ўзросце. Такую ж выплату атрымаюць інваліды і ўдзельнікі вайны, якія не знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні. А членам сем'яў вайскоўцаў, партызан і падпольшчыкаў, што загінулі падчас вайны, вызначана дапамога ў памеры 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце.

Не менш цікавы момант. Жыхарам сталіцы, якія знаходзяцца на надомным абслугоўванні і цалкам страцілі магчымасць рухацца, прадугледжваецца бясплатнае мыццё бялізны і цырульніцкія паслугі. І яшчэ. Сёлета працягнецца практыка дапамогі ва ўсталяванні індывідуальных прыбораў уліку вады адзінокім непрацуючым пенсіянерам, а таксама інвалідам I і II груп.

Што для III групы?

Адно з новаўвядзенняў. Інвалідам III групы, а таксама грамадзянам, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але па заключэнні медыкаў маюць патрэбу ў дапаможных сродках, прадугледжваецца кампенсацыя з бюджэту выдаткаў на пратэзаванне верхніх і ніжніх канечнасцяў. Апроч таго, зноў-такі па заключэнні медыкаў, інвалідам III групы і асобам, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але маюць патрэбу ў дапаможных сродках, прадугледжваецца кампенсацыя на набыццё стамійнага абсталявання — у суме да 130 тыс. рублёў.

Вырашыцца ў сталіцы і адна з найбольш няпростых праблемаў апошняга часу. Вызначана, што горад возьме на сябе ўсе выдаткі па забеспячэнні артапедычнымі вырабамі дзяцей, якія не з'яўляюцца інвалідамі, аднак па рэкамендацыях дактароў маюць патрэбу ў дапаможных сродках — скажам, у артапедычным абутку, гарсэтах, прыстасаваннях лячэння пазваночніка і дысплазіі тазасцегавых суставаў.

— Сёлета захоўваецца права на штомесячныя дапамогі непрацуючым інвалідам I і II груп, якія атрымліваюць сацыяльныя пенсіі і не знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні — пры ўмове, што гэтыя асобы не зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, — кажа начальнік аддзела адраснай дапамогі і гендэрных праблем Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Людміла Куляшова. — Як і дагэтуль, будуць аплачвацца абанементы на рэабілітацыю і курс лячэння адзін раз у год у Беларускім пратэзна-артапедычным аднаўленчым цэнтры асобным катэгорыям інвалідаў-калясачнікаў. А непрацуючыя інваліды I і II груп, якія пражываюць асобна ад сваякоў і атрымліваюць пенсіі, меншыя за бюджэт пражыткавага мінімуму, змогуць карыстацца бясплатным харчаваннем.

У летнік — не за поўны кошт

Сёлета ў сталіцы захаваецца практыка выплат гарадской дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 1 года, частковай кампенсацыі бацькам-бюджэтнікам кошту пуцёвак на наведванне дзецьмі загарадных летнікаў, даплат да поўнага кошту пуцёвак у абаронна-спартыўныя летнікі для цяжкіх падлеткаў. Прадугледжана і бюджэтная датацыя на пуцёўкі ў Мінскі гарадскі дзіцячы аздараўленчы лагер «Лідар» — у прыватнасці, патрапіць сюды могуць школьнікі, якія маюць асаблівыя дасягненні ў вучобе ці прадметных алімпіядах.

— Асобная гаворка аб сем'ях, што выхоўваюць трох і больш няпоўнагадовых дзяцей, — працягвае Людміла Куляшова. — Такім сем'ям мяркуецца выплаціць адназовую дапамогу на падрыхтоўку да школы з разліку па 30 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму на кожнае дзіця. Чатыры разы у год (напярэдадні Дня Канстытуцыі 15 сакавіка, Міжнароднага дня абароны дзяцей 1 чэрвеня, Дня маці 14 кастрычніка і Дня юрыста 7 снежня) шматдзетныя бацькі змогуць скарыстацца магчымасцямі бясплатнай кансультацыі ў натарыуса, а раз у квартал — адваката.

Плюс да таго, вызначана: мінскім жанчынам, якія атрымліваюць ордэн Маці, будзе рабіцца аднаразовая выплата ў 5 бюджэтаў пражыткавага мінімуму. Прычым усе ўладальніцы гэтага ордэна паранейшаму змогуць бясплатна карыстацца гарадскім грамадскім транспартам.

Умова — рэгістрацыя

Усе пералічаныя вышэй дадатковыя гарантыі ацэньваюцца ў 26 млрд рублёў. Прычым гэтыя грошы выдаткуе выключна сталічны бюджэт. Адпаведна, карыстацца дадатковай падтрымкай змогуць толькі непасрэдна жыхары сталіцы.

— У любым выпадку галоўнай падставай для выдзялення той ці іншай падтрымкі з'яўляецца пастаянная рэгістрацыя ў Мінску, — адзначае Людміла Куляшова. — Ці, прынамсі, калі заяркра ідзе аб падтрымцы на дзяцей, пастаянную сталічную «прапіску» павінен мець адзін з бацькоў.

Сяргей ГРЫБ.

Удасканальванне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання паспрыяе далейшай легалізацыі даходаў прыватнага бізнэсу

Як вядома, 3 студзеня 2009 года Кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Указ № 1, які датычыцца змяненняў і дапаўненняў парадку прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання для суб'ектаў малога прадпрымальніцтва. Пракаментаваць палажэнні гэтага дакумента згадзіўся намеснік начальніка ўпраўлення бюджэтна-падатковай палітыкі Міністэрства эканомікі Дзмітрый КІЙКО.

Паводле яго слоў, усе змяненні ва ўказе маюць на мэце яшчэ больш эфектыўнае прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, якую сёння выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці больш як 30 тысяч падаткаплацельшчыкаў. За апошнія 1,5 года, калі дзейнічае спрошчаная сістэма падаткаабкладання, спецыялістамі Мінэканомікі сумесна з экспертамі МПЗ была прааналізавана практыка яе прымянення і цяпер комплексна ўнесены змяненні, якія дазволяць істотна павысіць яе прывабнасць.

У першую чаргу ўказ памяншае стаўкі падаткаў. Цяпер стаўкі падаткаў па спрошчанай сістэме для суб'ектаў малога і сярэдняга бізнэсу памяншаюцца з 10 да 8 працэнтаў ад валавой выручкі без платы ПДВ, з 8 да 6 працэнтаў — з платай ПДВ, а таксама зніжаюцца з 20 да 15 працэнтаў — пры выкарыстанні ў якасці падатковай базы валавога даходу.

Другім галоўным момантам указа, паводле слоў Дзмітрыя Кійко, з'яўляецца павелічэнне гранічных памераў валавой выручкі, што дае права арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам пераходзіць на спрошчаную сістэму падаткаабкладання. Для гэтай мэты для арганізацый з колькасцю супрацоўнікаў да 15 чалавек гранічны памер валавой выручкі павялічваецца з 600 млн да 1 млрд рублёў у год, для арганізацый з колькасцю супрацоўнікаў да 100 чалавек — адпаведна з 2 млрд да 3,5 млрд рублёў у год.

Згодна з падлікамі спецыялістаў Мінэканомікі, у выніку гэтага павелічэння гранічных памераў валавой выручкі права на прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання дадаткова атрымае каля 4 тысяч арганізацый, а таксама істотная колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў. Павелічэнне гэтага крытэрыю разглядаецца дзяржаўнымі органамі ў якасці стымулу для легалізацыі прыватнага бізнэсу, у тым ліку ў сферы аказання паслуг насельніцтву. Другім момантам ва ўказе стала тое, што зніжаныя стаўкі падаткаў па спрошчанай сістэме падаткаабкладання ў памеры 3 і 5 працэнтаў цяпер распаўсюджваюцца на ўсе сельскія населеныя пункты і на ўсю тэрыторыю сельскай мясцовасці, а не толькі на аграгарадкі, як гэта было раней.

Дакументам змяняецца алгарытм вызначэння сярэдняй колькасці супрацоўнікаў арганізацый. Па новай методыцы будзе магчыма ўлічваць сезонныя ваганні працоўнай сілы ў сувязі з асаблівасцямі дзейнасці арганізацый. Указ уступіў у сілу з 1 студзеня 2009 года. Разам з тым, дзеля таго, каб ужо сёлета арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі маглі б перайсці на прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання па новых правілах, падоўжаны тэрмін падачы адпаведных заяў да 20 студзеня 2009 года ў падатковыя органы па месцы пастаноўкі на падатковы ўлік.

Сяргей КУРКАЧ.

Загінуў ад выбуху катла

60-гадовы апальшчык аршанскага філіяла прадпрыемства «Віцебскагрампрамтранс» загінуў з-за таго, што выбухнуў бытавы ацяпляльны кацёл, што працаваў на тэрыторыі прадпрыемства.

У выніку выбуху былі пашкоджаны сцены і канструкцыі перакрыцця будынка, дзе знаходзіўся кацёл. Пад завалам апынуўся супрацоўнік. Яго выцягнулі выратавальнікі, але па дарозе ў бальніцу мужчына памёр. Па папярэдняй версіі, выбух адбыўся з-за праблемаў з падачай вады ў ацяпляльны прыбор.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

**По поручению ОАО «Белэнергострой»
КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания пристройки к жилому дому ЖСК «Свислочь-плюс», об. пл. 713,6 кв.м, расположенного: Пуховичский район, г.п. Свислочь, ул. Строителей, д. 11. Начальная цена с НДС – 210 000 000 бел. рублей. Задаток в сумме 21 000 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Площадь земельного участка 0,0799 га. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **10.02.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.02.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015.

Абзац

■ У Мінску гэтай зімой абсталяваныя 110 каткоў і 16 хакейных каробак. Да канца тыдня спецыялісты абяцаюць заліць яшчэ 10 лядовых пляцовак і 16 хакейных каробак. Пачала працу гарадская лыжароллерная траса працягласцю 1,5 км. Каток на Кастрычніцкай плошчы наведваюць штодзень да 4 тыс. чалавек.

■ **Больш за 1,5 тыс. чалавек загінулі ў ДТЗ на дарогах Беларусі за 2008 год. Усяго зафіксавана 7175 ДТЗ, паранена 7510 чалавек.**

■ У амерыканскім штаце Вірджынія 6-гадовы хлопчык самастойна адправіўся ў школу на маміным аўтамабілі. Спазніўшыся на школьны аўтобус, ён узяў з матчынай сумкі ключы ад аўтамабіля Ford Taurus і вырашыў дабрацца да школы. Малы аўтамабіліст праехаў 16 км, але трапіў у невялікую аварыю, з'ехаўшы з дарогі. Яго паездку спыніў слуп, але хлопчык працягваў шлях пехатою і дабраўся да школы, дзе яго адразу ж адправілі ў медпункт для лячэння драпінаў. Уменне вадзіць аўтамабіль хлопчык атрымаў, гуляючы на камп'ютары. Паліцэйскія былі вельмі здзіўленыя тым, што дзіця здзейсніла некалькі складаных манеўраў, у т.л. два абгоны і два павароты пад вуглом у 90 градусаў. Маці хлопчыка арыштавалі па абвінавачанні ў стварэнні пагрозы жыццю дзіцяці.

Поўны абзац

■ **Былы саліст гурта «Кар-Мэн» Багдан Цітамір на днях ледзь не трапіў у бальніцу пасля таго, як у яго Porsche Cayenne ўрэзалася іншамарка, за рулём якой сядзела дзяўчына. Чырвоная Audi пратараніла шыкоўны пазадарожнік куміра моладзі 90-х гадоў у цэнтры Масквы. Узрушаны Цітамір выйшаў з машыны і прапанаваў парушальніцы выклікаць супрацоўнікаў службы бяспекі руху, але тая аблаяла спевака матам і націснула на газ. «Я не паспеў адскочыць. Удар прыйшоўся прама ў пах!» — расказаў Багдан. Ад удару ён упаў прама на капот Audi, іншамарка працягнула яго метраў 20 у такім стане. Калі Цітаміру ўдалося саскочыць на асфальт, дзяўчына дадала хуткасці і знікла. Пацярпелы напісаў заяву ў міліцыю.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

У МАГІЛЁВЕ ГАТАВАЛІ ЮШКУ НА ЎСІХ

Калі традыцыйныя навагоднія застоллі надакучылі, а на дварэ — сапраўдная зіма і ў душы — святочны калядны настрой, магіляўчан запрашаюць на конкурс прыгатавання добрай юшкі.

Сваё майстэрства аматары юшкі дэманстравалі 7 студзеня на паляне ў Пячэрскім лесапарку. У конкурсе бралі ўдзел два дзясяткі камандаў, якія былі прадстаўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый абласнога цэнтра.

У кожнай каманды — свой рэцэпт юшкі: адны варылі булён з дробнай рыбы і потым дадавалі вялікую, іншыя клалі ў суп толькі цэлыя бульбіны, трэція выкарыстоўвалі крупы, чацвёртыя — чырвоную акіянскую рыбу. А самая смелая каманда далівала ў юшку гарэлку!

Праўда, усімі сакрэтамі прыгатавання смачнай юшкі ўдзельнікі конкурсу не спяшаліся дзяліцца з шырокай публікай, затое самой юшкай частавалі ахвотна і бясплатна.

Больш за ўсё юшкі для магіляўчан наварыла каманда Магілёўскага гарвадаканала пад сімвалічнай назвай «Вадалей». Рыбай кухараў забяспечылі рыбакі гэтага прадпрыемства. У выніку «Вадалей» атрымаў першае месца і каштоўны падарунак. Усе каманды, якія бралі ўдзел у конкурсе, узнагародзілі шакаладам. Так што юшку можна было заесці салодкім прызам.

Ілона ІВАНОВА.

Афіцыйна

За шматгадовую плённую працу, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, прафесійнае майстэрства, значны ўклад у развіццё паліўна-энергетычнага комплексу, заслугі ў развіцці адукацыі, аховы здароўя, культуры Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам узнагародзіў 51 грамадзяніна краіны.

Ордэна Айчыны II ступені ўдастоены першы намеснік міністра энергетыкі Эдуард Таўпянец і галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі траўматычных пашкоджанняў пазваночніка і спіннога мозга Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі Іосіф Варановіч.

Ордэнам Пашаны адзначаны генеральны дырэктар КУП «Брэстаблдарбуд» Пётр Скорабагацька і работнікі Беларускага аўтамабільнага завода Ілья Арцёмаў, Васіль Здановіч і Анатоль Камінскі.

Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» дырэктар Слуцкага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя Мікалай Кавальчук, дырэктар ААТ «Брэсцкі камбінат будаўнічых матэрыялаў» Уладзімір Марозаў, кіраўнік групы аддзела палітычных аглядальнікаў агенцтва тэлевізійных навін Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Інга Хрушчова і іншыя.

Медаля Францыска Скарыны ўдастоены вядучы майстар сцэны Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Галіна Лабанок, дырэктар санаторыя «Белая Русь» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Алег Невяркевіч, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарвыканкама Анатоль Сабітаў і дырэктар — мастацкі кіраўнік музычнай капэлы «Санорус» Мінскай вобласці Аляксей Шут.

* * *

За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі кіруючы склад Міністэрства абароны. Міністр абароны генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў удастоены ордэна Воінскай Славы.

Ордэнам «За службу Радзіме» II ступені адзначаны начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сілаў — першы намеснік міністра абароны генерал-лейтэнант Сяргей Гурулёў і першы намеснік начальніка Генштаба УС генерал-маёр Пётр Ціханоўскі.

Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны УС генерал-маёр Ігар Азаронак, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення маральна-псіхалагічнага забеспячэння галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны палкоўнік Аляксандр Дуньковіч і начальнік упраўлення радыёэлектроннай барацьбы Генштаба УС палкоўнік Валерый Кучаеў.

Начальнік 4-га ўпраўлення галоўнага аператыўнага ўпраўлення Генштаба Узброеных Сілаў палкоўнік Павел Грэнь і камандзір 308-га асобнага ракетнага дывізіёна 465-й ракетнай брыгады Узброеных Сілаў падпалкоўнік Юрый Лаўрыкаў узнагароджаны медалём «За адзнаку ў воінскай службе».

* * *

У адпаведнасці з часткай другой артыкула 91 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец назначаны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання. Указ аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 5 студзеня.

* * *

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам устанавіў гранічны памер дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту на 2009 год у суме Br0,0 тыс. Такім чынам, сумы даходаў і расходаў рэспубліканскага бюджэту вызначаюцца роўнымі.

* * *

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сваім указам прысвоіў ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» артыстам балета — вядучым майстрам сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Юліі Дзятко і Канстанціну Кузняцову. Ганаровага звання артысты балета ўдастоены за высокае прафесійнае майстэрства, заслугі ў развіцці беларускага балетнага мастацтва.

* * *

Міністру ўнутраных спраў Уладзіміру Навумаву і старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Георгію Кузняцову за непрыняцце належных мераў па забеспячэнні кантролю за выкананнем заканадаўства пры прадастаўленні супрацоўнікам МУС зямельных участкаў у раёне дачнага пасёлка «Крынічны» Міністэрства ўнутраных спраў аб'яўлена вымова. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 5 студзеня.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ХАКЕЙНАЯ КАМАНДА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ЎЗЯЛА РЭВАНШ У «ГАЗПРАМА»

У Мінску завяршыўся V Міжнародны Калядны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У чацвёрты раз яго выйграла каманда Прэзідэнта Беларусі, якая ў фінале перайграла расійскую дружыну «Газпрамэкспарт» з лікам 1:4.

У складзе беларускай каманды шайбы закінулі Арцём Сянькевіч, Павел Белы, Алег Мікульчык і Ігар Андрушчанка, у расіян рэалізаваў буліт Валерый Каменскі, які, дарэчы, з'яўляецца трохразовым чэмпіёнам свету, Алімпійскім чэмпіёнам-1988, уладальнікам Кубка Стэнлі-1996. «Газпрам» з'яўляецца прадстаўніком расійскага боку на турніры ў другі раз, і сёлета каманду акрамя Валерыя Каменскага ўзмацніў чэмпіён свету-1990 і Алімпійскі чэмпіён-1992 Уладзімір Малахаў. Да фіналу беларуская дружына таксама ўзмацнілася, у прыватнасці, на лёд сталічнага Палаца спорту выйшлі абаронца Аляксандр Радзінскі і нападаючыя Канстанцін Захараў і Раман Раманенка (усе трое выступаюць за сталічнае «Юнацтва»).

Трэцяе месца на турніры заняла каманда Фінляндыі, якая перамагла ў вырашальнай сустрэчы аўстрыйцаў з лікам 9:6. Лепшым вратаром турніру названы расіянін Максім Міхайлоўскі, лепшы абаронца — фін Нэма Нокасмякі, лепшы нападаючы — беларус Сяргей Шыткоўскі. Лепшым бамбардзірам прызнаны галоўны трэнер мінскага «Юнацтва» і нападаючы каманды Прэзідэнта Міхаіл Захараў, які па сістэме «гол плюс пас» набраў 15 балаў.

Міхаіл Захараў расказаў, што ў сваёй практыцы даўно так не настройваўся на матч, маючы на ўвазе пройгрыш у фінале «Газпрама» ў 2007 годзе. «Пра рэванш мы таксама думалі. Каманда «Газпрама» ў параўнанні з 2007 годам узмацніліся, але і мы таксама. У расійскай камандзе не было слабых месцаў, і ўсе галы даваліся нам няпроста. Не чакаў, што ў такім турніры стану лепшым бамбардзірам. І вельмі задаволены, што ўдалося набраць столькі ачкоў і прынесці карысць камандзе. Хачу падзякаваць сваім партнёрам, якія дапаможаць заваяваць мне гэты прыз і павіншаваць нашых балельшчыкаў з перамогай», — падзяліўся Міхаіл Захараў. Валерый Каменскі расказаў, што ўпершыню ўдзельнічае ў турніры, і прызнаўся, што меў вялікае задавальненне ад удзелу ў гэтых спаборніцтвах, а Прэзідэнт Беларусі, з якім хакеісту ўдалося перакінуцца парай слоў, падзякаваў за прыезд.

Старшыня Федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў на цырымоніі закрыцця турніру адзначыў яго традыцыйную высокую арганізацыю і сказаў, што ўсе сёлетнія ўдзельнікі спаборніцтваў пакінулі заяўкі на ўдзел у наступным, шостым Калядным турніры аматараў хакея.

Алена КРАВЕЦ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

многоквартирного жилого дома по улице Волгоградской, 64 (крупнопанельный односекционный 10-этажный 40-квартирный жилой дом) (с изменениями и дополнениями)

Совместное общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНТЕ-РОБА» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о Застройщике.

ЗАСТРОЙЩИК (Заказчик) – СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2004 года № 653 в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190527399.

Адрес Застройщика: 220103, г. Минск, ул. Калиновского, 77а, ком. 304, телефон/факс: 281 41 15, 281 21 98.

Режим работы: понедельник – пятница: с 8.30 до 17.30, выходные дни: суббота, воскресенье, обед: 13.30 – 14.30.

В течение предыдущих трех лет организацией строительство не осуществлялось.

Информация о проекте.

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору о реализации права проектирования и строительства объекта *«Многоквартирного жилого дома по ул. Волгоградская, 64 в г. Минске»* от 27 августа 2008 г. с Минским городским исполнительным комитетом.

Объект долевого строительства — многоквартирный 10-этажный крупнопанельный жилой дом (односекционный 40-квартирный жилой дом, не относящийся к домам повышенной комфортности) серии М111-90.БС40, с подвалом, техническими помещениями, чердаком, высота жилых этажей – 2,6 метра. Фундаменты – ленточные сплошные из сборных железобетонных плит серии Б1.012.-1-1-99 и бетонных блоков серии Б1.016.1-1. Категория комфортности по шуму – «В». Потолки – железобетонные панели. Стены и перегородки – железобетонные панели, а также из кирпича и ячеистых блоков. Полы – подготовка без покрытия (железобетонная стяжка). Вентиляция жилых помещений – естественная. Отопление, электричество, водоснабжение

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

9

СТУДЗЕНЯ
2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 1 (15555)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

АДЗІН ШЧАСЛІВЫ ДЗЕНЬ СТАРОГА ГОДА,

ці Як Новы год сустрэлі ў дзіцячым анкацэнтры

У дзіцячым анкагематалагічным цэнтры ў Бараўлянах адбыўся вялікі святочны канцэрт. Ужо традыцыйна дзяцей прыехалі павіншаваць зоркі беларускай эстрады, клоўны, фокуснік, некалькі Дзядоў Маразоў і Снягурак.

Для творчай групы Тамары Лісіцкай і калектыву дабрачыннага партала help-me.by гэта далёка не першая акцыя такога кшталту. Ужо наладжана сістэма збору падарункаў, іх фарміравання і размеркавання. Псіхолагі і педагогі цэнтра перадаюць каардынатарам інфармацыю пра дзяцей, іх захапленні і мары. Спісы вывешваюць на сайце. Любы чалавек можа выбрать дзіця, зрабіць яму імянны падарунак і перадаць каардынатарам.

— Падарункаў з кожным разам перадаюць усё больш, — радасна паведамляе Тамара Лісіцкая. — Нават новыя дзеці атрымаюць стракатыя пакункі. Кожны дзень у анкацэнтр паступаюць дзясяткі новых пацыентаў, і столькі ж з'язджаюць дадому пасля лячэння. Тыя, што з'ехалі, зноў вяртаюцца, каб працягнуць курсы тэрапіі, а тыя, хто выпісаны дадому з доўгачаканым вердыктам «здаровы», вяртаюцца спецыяльна за падарункам. І кожны раз ёсць верагоднасць засмуціць тых дзяцей, што ў спіс па розных прычынах не былі занесеныя. Дзякуючы шчодрасці і дабрыні людзей, што перадавалі падарункі, семдзесят «няўлічаных» навічкоў таксама атрымаюць падарункі.

Кабінет сацыяльнай службы сёння нагадвае навагодні мурашнік.

— Яшчэ адзін падарунак для Рынкевіча Сашы! Дзе яго пакунак? Іх трэба паставіць разам!

— У які бок класці падарункі для малодшага ўзросту?

— Вось гэта для вашага аддзялення. Складайце ў тачку і можаце пакрысе перавозіць на свой паверх. Толькі каб дзеці пакуль не бачылі! Дзед Мароз будзе віншаваць іх пасля канцэрта.

— Тэрмінова патрэбны Дзед Мароз! У нас сёння Дзіма выпісваецца — віншаваць будзем зараз. Падымайцеся на чацвёрты.

Адны звяраюць спісы, другія фарміруюць пакункі з салодкім, трэція высвятляюць, каму ўручыць непадпісаныя падарункі. Тома Лісіцкая расказвае навічкам, як сябе паводзіць з дзецьмі.

У маленькіх пацыентаў наперадзе яшчэ некалькі ранішнікаў — у перадсвяточны час да іх кожны дзень прыязджаюць розныя творчыя калектывы з віншаваннямі. Але сёння, безумоўна, самы жаданы і самы доўгачаканы канцэрт. Прыхарошваюцца дзеці з раніцы: старэйшыя дзяўчаты фарбуюцца, меншыя выцягваюць з шафы карнавальныя касцюмы. Будуць сёння ў зале і феі, і прынцэсы, і матылькі, і чорцікі. Месцы займаюць за паўгадзіны да канцэрта, бо ахвотных шмат.

Вольга Старавойтава год таму лячылася ў цэнтры. Сёння яна прыехала спецыяльна на канцэрт.

— Медсястра заўсёды казала, што я падобная да прынцэсы, — хваліцца Вольга. — Вось мне і падарылі Барбі. Адну — модніцу ў прыгожай сукенцы, а другую разам з Кэнам. Столькі падарункаў, столькі ўвагі, што мне нават няёмка!

— Вова, а ты чаму не ідзеш на канцэрт? — пытаюся ў надта сур'ёзнага хлопца.

— Я што, маленькі? Гэтыя клоўны і фокуснікі не для мяне.

— А я, па-твойму, маленькая? — далучаецца да размовы Віялета Дзмітрыеўна, медсястра і педагог анкагематалагічнага аддзялення для дзяцей старэйшага ўзросту. — Але з задавальненнем пагляджу канцэрт!

У рэшце рэшт Вова згаджаецца пайсці, абы мы адчапіліся.

ФОКУСЫ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ

Спачатку на сцэну запрашаюць галоўных артыстаў — саміх дзяцей. Ахвотных расказаць верш Дзеду Марозу знайшлося шмат. Стары не шкадуе падарункаў. З віншаваннямі ў цэнтр прыехалі Вольга Плотнікава, Пётр Елфімаў, клоўн дзяўчынка Кася са сваёй Лялькай, фокуснік Пётр Стасевіч і гурт «Без білета». Глядач тут надзвычай чуйны, таму фальшывай усмешкай яго не возмеш. Дарослыя артысты ведаюць гэта і выходзяць на сцэну з адкрытымі сэрцамі. Іх вітаюць цёплымі апладысментамі і шчырай увагай.

Пётр Стасевіч прыязджае ў Бараўляны на кожны канцэрт. Дзве мамы за маёй спінай абмяркоўваюць, адкуль магла ўзяцца бутэлька шампанскага ў пустым кубе. Адзін за адным на сцэну падымаюцца дзеці, правяраюць, ці не падманвае фокуснік. Для большага даверу ён спускаецца ў залу і раздае рабочыя прылады: паспрабуйце самі. Даўнія пацыенты не раз бачылі яго фокусы, але так і не змаглі разгадаць іх сакрэт.

На галёрцы вачыма знаходжу Вову з аддзялення старэйшага ўзросту, кіўком галавы пытаюся: ну як? Класна, адказвае Вова, паказваючы вялікі палец, і ўсміхаецца.

Пётр Елфімаў на каранціне. Песень не спявае, гаворыць хрыплым шэптам у мікрафон:

— Спяваць, на жаль, сёння не магу. Я прыехаў, каб проста пабыць з вамі. А калі ачуняю і ў наступны раз буду спяваць, то буду ўяўляць, што выступаю перад вамі.

Падпісаныя плакаты і дыскі разышліся імгненна. У «Без білета» знайшлося столькі прыхільнікаў сярод жыхароў дзіцячага цэнтра, што склалі вялікі спіс тых, каму не хапіла дыскаў і плакатаў. «Хутка будуць яшчэ, усё перадамо!» — абяцаюць Віталь Артыст і Павел Кудрын і накіроўваюцца ў аддзяленне да тых, хто не змог прыйсці на канцэрт.

КАНЦЭРТ ПАСЛЯ КАНЦЭРТА

У палаце іх чакае Саша, даўні прыхільнік «Без білета».

— Трымай, спецыяльна для цябе дыск. Зараз падпішам.

— Дай пацісну руку нарэшце, — не вытрымлівае Саша.

— Саш, калі ты не супраць, мы б хацелі з табой сфоткацца.

Проста ў палаце пачынаецца інтэрв'ю: дзеці распытваюць пра старыя песні, пра новыя альбомы, пра творчасць і пра прозвішча Артыста. Віталь дэманструе пашпарт недаверлівым прыхільнікам, спявае разам з імі песні, адказвае на ўсе пытанні, з ходу прыдумляе гульні.

Сашу праз пару дзён чакае трансплантацыя коснага мозгу. Кажа, што гэта сустрэча, падбадзёрыла і надала настрою.

— Я даўно люблю гэты гурт і марыў (не проста хацеў, а марыў!) сустрэцца з імі. І вось яны тут, зусім побач. Нават не верыцца! Мы з Віталем Артыстам абмяняліся нумарамі — будзем стэлефаноўвацца. Калі спраўдзвяецца тое, пра што марыцца, на душы робіцца лягчэй, і фізічных сілаў прыбаўляецца, так і хваробу хутчэй пераможам!

У холе сабралося ўсё аддзяленне. Проста так «безбілетнікаў» не адпусцяць. Віталь хутка дзеліць усіх на сапрана і тэнары. Усяго некалькі хвілін рэпетыцыі — і перада мной выступае зводны хор «Без білета» і нашай будучыні, моладзі з Бараўлянаў, пад кіраўніцтвам Віталя Артыста.

— Вова, а ты чаму не фатаграфуешся з «Без білета»? Што, зноў не ў гуморы?

— Дык і мы сур'ёзныя пацаны. Давайце разам з сур'ёзнымі тварамі так і сфоткаемся, — шукае падыход да хлопца Віталь Артыст.

— Давайце, — згаджаецца Вова і ўсміхаецца.

Тут і Дзед Мароз падаспеў са Снягуркай — Вольгай Плотнікавай. «Падарункі ў кожную палату», — такі ў іх дэвіз. У знак удзячнасці дзеці ўручылі гасцям сувеніры, зробленыя сваімі рукамі. І абавязкова дарылі Анёлаў. Тут гэта лічыцца самым важным падарункам.

— Ого, колькі ўсяго! — дзівіцца на свой падарунак Вольга. — Вышыўка, набор для творчасці, бісер... Будзе чым заняцца — мяне на Новы год не адпускаюць дадому, у бальніцы застаюся.

— Дзяўчаты, паказвайце свае падарункі, — уваходзіць у палату Жэнька. Ён ужо абышоў паўаддзялення і можа падзяліцца назіраннямі, што каму падарылі.

— Улад, а табе што Дзед Мароз прынёс?

— Мне не Дзед Мароз, мне Вольга Плотнікава прынесла!

СЯБРЫ-ПАЦЫЕНТЫ І ГАРБАТА НА ТРАІХ

Многія дзеці паехалі дадому на Новы год, некаторыя дома на рэмісіі. Свае падарункі яны атрымаюць пазней ад педагога. Віялета Дзмітрыеўна разглядае ў кабінеце падарункі, што засталіся, фарміруе новыя для тых, хто не трапіў у інтэрнэт-спісы.

— Так, гэта чый? Ага, Вадзіма. Ён прыедзе праз два дні. Дыскі, добра. Канструктар «Лега» — выдатна. Значыць, яшчэ адна мара спраўдзіцца. Вось лялька для Крысціны. Дзяўчынка даўно марыла пра яе, а бацькі не могуць сабе дазволіць такую пакупку. О, яшчэ адна. Дзве адразу дарыць ці...

Віялета доўга не вагаецца. Яна падтрымлівае сувязь з многімі бацькамі, дзеці якіх знаходзяцца на рэмісіі. Хутка ў тэлефоне знаходзіць нумар Крысцінінай мамы.

— Мама, Вольга, прывітанне. Вы заўтра да нас прыязджаеце аналізы здаваць? Добра, тады адразу да мяне зайдзіце. Ажыццяўляць вашу мару атрымалася. Толькі я вось думаю, абедзве лялькі зараз падарыць ці адну адкласці на іншае свята. Як думаеш?

Далей тэлефануе 18-гадоваму Алегу ў Бабруйск. Яго павіншавалі ўчора, калі прыязджаў у цэнтр на кантроль. Алег цяпер часта бывае ў Мінску. Ён паступіў на завочнае аддзяленне ва ўніверсітэт. Пасля таго, як зрабілі пратэзаванне косці, мара быць выратавальнікам рухнула. Хлопец вырашыў працягнуць сямейную дынастыю і стаць юрыстам. Цікавіцца падзеямі ваенных часоў. Ён надзвычай адкрыты, камунікабельны, аптыміст і валодае адметным пачуццём гумару.

— Прывітанне, Алежка! Рана з'ехаў: тут табе яшчэ падарункі перадалі. Не, не скажу, гэта сюрпрыз! Прыедзеш — убачыш. Ну, адно магу сказаць: табе вельмі спадабаецца. Расказвай, што было ва ўчарашнім пакунку.

Віялета свеціцца — дагадзілі Алегу, падарылі кнігу «Хаджэнне Напалеона» з малюнкамі, схемамі, картамі. Маці крычыць у трубку: «Абалдзенная кніга, яго не адарваць!». Віялета радуецца, як маленькая, і паказвае мне вачыма на стол. Там ляжыць яшчэ адна кніга і вялікая зборная мадэль ваеннага карабля.

— Ну, зараз разнясём садавіну па палатах і можам адпачываць, — выдыхае медсястра і педагог у адной асобе. — А паехалі да мяне на гарбату. Я сёння ў госці чакаю аднаго былога пацыента. Толькі трэба не забыць падарунак яго забраць. Нагадаеш!

Сённяшні дзень для Віялеты таксама вялікае свята. Яна шчаслівая, калі шчаслівыя ее сябры.

Таццяна САЛДАЦЕНКА.

СВЕТ МОЙ, ЛЮСТЭРАЧКА, СКАЖЫ...

Гюнеш імкнецца на пэўную вышыню, а Сяргею Крыўцу падабаецца глядзець на Анджэліну Джолі

Аб чалавеку можна скласці меркаванне, абапіраючыся на самыя розныя дробязі. Найбольш распаўсюджаны метад — звярнуць увагу на адзенне. Як кажуць у народзе — па адзенні сустракаюць. А вось адзін мой знаёмы ў момант вырашаў для сябе годнасць чалавека па абутку. «Мне дастаткова толькі зірнуць на боты ці пантофлі, — важна распавядаў Санёк, — і я ўсё ведаю пра гэту персону».

Пад уздзеяннем сучасных камунікацыйных тэхналогій я вырашыў высветліць таямнічыя падрабязнасці аб чалавеку, ведаючы толькі дзве рэчы — мелодыю яго мабільнага тэлефона і малюнак на экране гэтага самага тэлефона. З такой нагоды я спачатку пагутарыў з вядомымі людзьмі нашай краіны, а потым звярнуўся да псіхолага, каб атрымаць тлумачэнне атрыманай інфармацыі.

ГЮНЕШ, спявачка, удзельніца фіналу «Еўрафэсту»: «Многія беларускія эстрадныя выканаўцы, накалькі я ведаю, ставяць свае песні ў якасці музыкі на мабільніку. Мне ўсе гэтыя рынгтоны не вельмі падабаюцца, таму я імі не карыстаюся і часцей за ўсё ў мяне гудзе «вібра». А на экране — неверагодна прыгожыя птушкі, якія некуды ляцяць».

Дзмітрый ШАКУТА, шматразовы чэмпіён свету па муай-тай, тайландскім боксе: «Паколькі я займаюся адзінаборствамі, на экране майго тэлефона ў якасці малюнка тайландскі баксёр, а дакладней — я сам. А мелодыя — вядомы ў 90-х сярод моладзі «Scatman.»

Раман ПАДАЛЯКА, акцёр Купалаўскага тэатра: «Ніколі не надаваў увагі такім рэчам. Таму ў якасці малюнка на маім тэлефоне звычайны гадзіннік. Музыка з мабільнага тэлефона гучыць рэдка, а калі ўсё ж гучыць, то гэта беларуская музыка — Зміцер Вайцюшкевіч ці Агінскі».

Сяргей КРЫВЕЦ, пяўабаронца барысаўскага БАТЭ, аўтар першага ў гісторыі беларускага футбола гола ў матчы групавога этапа Лігі чэмпіёнаў: «У нас малады калектыў, таму сочым за навінкамі, «качаем» іх, перакідваем адзін ад аднаго праз Blue-Tooth. Асабіста я раней часта мяняў і мелодыі, і малюнкі. Больш за іншых трымаліся розныя машыны і Анджэліна Джолі. А сёння мала цікаўлюся ўсімі гэтымі модным рэчамі. Мелодыя ў мяне — адна і тая ж са стандартных, што былі на тэлефоне. Малюнак таксама звычайны — нейкія светлыя рысачкі на фіялетавым фоне».

Галіна ПАЛЯНСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі: «Мелодыя ў мяне адна і тая ж, нейтральная. Гэтаксама як і малюнак — звычайная колеравая гама з пераважай яркіх адценняў. Я ж тэлефонам карыстаюся ў грамадстве, менавіта гэтым і тлумачыцца такі выбар. Часам даводзіцца рабіць так бы мовіць непранікальны твар, і тэлефон у такім выпадку можа адыграць дрэнную службу».

Выбар мелодый і малюнкаў, душэўныя патрабаванні і падсвядомыя рэакцыі асобы тлумачыць **Ала ШАХАВА, загадчык псіхалагічнай лабараторыі мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансэра**.

Адразу хочацца папярэдзіць тых, хто любіць крытыкаваць заўсёды і ўсё. Інфармацыя, якая знаходзіцца далей, не з'яўляецца ісцінай у апошняй інстанцыі, а ўсяго толькі спроба высветліць невядомыя раней рэчы. Менавіта таму вялікая просьба да ўсіх, хто падуладны маразматычнаму крахтанню, далей не чытаць.

— Птушкі ў Гюнеш — сімвал волі і незалежнасці, палёту, жаданне дасягнуць чаго-небудзь, узняцца на пэўную вышыню, — распавядае Ала Шахава. — Птушка спявае тое, што ёй хочацца. І нельга не заўважыць, што тут прысутнічае агульнасць сферы дзейнасці, чым магчыма і тлумачыцца такі выбар. А адсутнасць мелодыі і «вібразванок» могуць адзначаць зноў-такі незалежнасць. Гюнеш сама спявае і цішыня, якую яна стварае вакол сябе, можа адлюстроўваць глыбінныя перажыванні і быць жаданнем пазбавіць сябе ад старонніх гукаў. У такія моманты чалавеку хочацца пабыць аднаму і падумаць аб такіх рэчах, пра якія ён можа нікому і ніколі не сказаць.

Я ведаю шмат людзей, якія самі не карыстаюцца мелодыямі, негатыўна і злаславя рэагуюць на тых, у каго побач звоніць тэлефон.

— А што можна сказаць пра чалавека, у якога ў якасці малюнка фатаграфія сябе любімага, акрамя таго, што ён схільны да нарцысізму?

— Тут нельга катэгарычна даваць такія адзнакі. Фатаграфія на тэлефоне Дзмітрыя Шакуты можа расказаць і аб тым, што чалавек такім чынам падае сябе. Трэба ўлічваць і спецыфіку дзейнасці. Калі чалавек з дзяцінства займаецца спортам, напрыклад, ён цягнецца да поспеху, імкнецца да прызнання. Гэта ж яшчэ і асаблівасці канкрэтнага чалавека, пэўная матывацыйная накіраванасць гэтай асобы. Да ўсяго тут можна весці гаворку пра тое, што чалавек нагадвае сабе, што ён моцны, пераможца. Пасля вялікіх поспехаў юнацкім падыходам. І абсалютна не важна, пра каго тут ідзе гаворка — маладога чалавека ці дзяўчыну — калі мы маем на ўвазе агульнавядомы сэкс-сімвал. Тое ж самае можна сказаць і пра машыны, камп'ютарных герояў і г.д. Можна замяніць на экране мабільніка Брэда Пітта на Бена Афлека, а Анджэліну Джолі на Шарліз Тэрон, аднак сутнасць застанецца адна і тая ж. Такім чынам чалавек на падсвядомым узроўні дэманструе свае патаемныя жаданні.

Змены адбываюцца або з дасягненнем сваіх мэтаў, або з парогам перасыці. Якім бы смачным ні было марожанае, з цягам часу яно нам надакучвае. Густы нашы мяняюцца. А вядомыя прыгажуні, мусіць, знікнуць з тэлефона пасля таго, як чалавек знойдзе рэальнага чалавека, іншымі словамі, закахаецца. Аналагічна і з усім астатнім.

— Атрымліваецца, што лепшае рашэнне — гэта паставіць на застаўку любага чалавека?

— Сапраўды, гэта адзін з найбольш адэкватных падыходаў — тое, што блізка і дорага. Гэта як спроба кожны дзень і нават па некалькі разоў на дзень нагадваць — заўсёды са мною, у маім сэрцы і ў маіх думках. Хоць ніколі не трэба рабіць паспяховых высноў па нейкіх ускосных характарыстыках. Напрыклад, калі ў чалавека чорны тэлефон, чорны экран і адсутнасць музыкі, гэта яшчэ не азначае, што ён перастаў цікавіцца жыццём. Вось калі такі чалавек знаходзіцца ў падаўленым стане, жаліцца на дрэнны настрой і дэманструе незацікаўленасць наваколлем, не сочыць за сваім знешнім выглядам, у такім выпадку можна весці гаворку пра трывожныя сігналы. Што б ні было, ацэньваць чалавека па нейкіх вырваных з кантэксту дробязях абсалютна няправільна. Таму што кожны чалавек — гэта ў першую чаргу Асоба, рознабаковая, непаўторная і са сваім унікальным унутраным светам.

Юрась ШАЎЦОЎ

ЭКЗАМЕНЫ НА НОСЕ,

ці Як здаць сесію на выдатна?

Якія жаданні загадваюць людзі пад бой гадзінніка ў навагоднюю ноч? Адказаць на гэта пытанне складана. Але я з упэўненасцю магу назваць адно з патаемных жаданняў кожнага студэнта — добра здаць зімовую сесію. Адна надзея на Дзеда Мароза не дапаможа атрымаць выдатныя адзнакі ў залікоўку. Трэба ўмець рыхтавацца да экзаменаў не праз сілу, а з задавальненнем і з добрым настроем. Паспрабуем?

Кубачак са Шрэкам

Падчас падрыхтоўкі да экзамена на стале студэнта, акрамя падручнікаў, канспектаў і спіса з пытаннямі, стаіць, безумоўна, кубачак з кавай. Каву медыкі не рэкамендуюць, а вось сам кубачак можа быць карысным. Купіце ў краме рознакаляровы, кідкі, з цікавымі малюнкамі (лепш з незразумелымі) кубак. У перыяд падрыхтоўкі час ад часу затрымлівайце на ім позірк, разглядайце ўзоры, старайцеся знайсці ў малюнках розныя геаметрычныя фігуры, літары, лічбы. Гэта дапаможа адпачыць вашым вачам, галаве, здыме напружанне і надасць новыя сілы. Так, мая сяброўка амаль ва ўсе вандроўкі і паездкі бярэ з сабой менавіта свой кубак, дзе намаляваныя вясёлыя героі з мультфільма «Шрэк». На пытанне «навошта?» яна адказала, што вясёлыя пыскі герояў заўсёды прымушаюць яе ўсміхнуцца і ўздымаюць настрой на ўвесь дзень. Магчыма, і ваш кубачак стане першым крокам на шляху да выдатнай адзнакі.

Гербарый у падручніку

Хто са студэнтаў у зімовую сесію не марыў вярнуцца назад у восень, у першыя тыдні семестра? «Вось тады я добра ўзяўся б за вучобу і, напэўна, атрымаў бы адзнакі па прадметах аўтаматам...» — разважае студэнт. На жаль, час не вернеш. Але кавалачак восеньскай прыроды падчас марозу і сцюжы за акном мы можам вам гарантаваць. Для гэтага загадзя, восенню, збярыце прыгожыя восеньскія кветкі, лісце, галінкі, пакладзіце іх на розныя старонкі падручніка, па якім вы будзеце рыхтавацца да экзамена ў сесію. Зімой, у час падрыхтоўкі, кожная новая перагорнутая старонка кнігі падорыць вам чароўны пах, прыемныя ўспаміны і, безумоўна, добры настрой. Гэта парада дапаможа вам актывізаваць працэс: так і хочацца хутчэй вывучыць гэтую старонку і перагарнуць яе, каб на наступнай палюбавацца і адчуць пах ужо іншай кветкі, узгадаць нешта іншае.

Два зайцы

Як вядома, адпачыць для студэнта — гэта значыць паспаць да дванаццатай гадзіны, правесці рэшту дня перад тэлевізарам, а ўвечары сустрэцца з сябрамі ў начным клубе. У сесію гэтая формула не працуе, а адпачынак нашай галаве неабходны. Тут на дапамогу прыходзяць медыкі, якія сцвярджаюць, што адпачынак — гэта перш за ўсё змена віду дзейнасці. Напрыклад, калі вы пішаце, адпачынкам для вас можа стаць чытанне кнігі.

Падчас падрыхтоўкі гэтай парадай студэнту скарыстацца вельмі лёгка. Калі вы вучыце вусны экзамен, час ад часу звяртайцеся да пісьмовага: займіцеся рашэннем задач, вылічэннямі ці чарцяжамі. Так вы не толькі дасце сваёй галаве адпачыць, але і заб'яце двух зайцаў адным стрэлам.

Падрыхтоўка пад «дажджом»

Думкі аб тым, што паслязаўтра экзамен, а яшчэ палова пытанняў не падрыхтаваная, не дапамогуць хутчэй набыць веды. Трэба браца за кнігу спакойна, са светлай галавой. Аднак зрабіць гэта, калі на носе экзамен, не так лёгка. Дапамагчы ў гэтым могуць прыемныя гукі: шум мора, дажджу, ветру, спевы птушак. Зімой за пісьмовым сталом іх пачуць немагчыма, а вось купіць запісы з гэтымі гукамі ў краме рэальна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Саромеецеся спытаць у бацькоў?

Дык звяртайцеся ў «Поспех»!

Кожнага школьніка турбуюць пытанні, якія ён баіцца ці саромеецца задаць бацькам. Затое, калі ёсць надзейныя сябры, то можна спытаць у іх. Для гэтага і існуюць Цэнтры сяброўскага стаўлення да падлеткаў.

Моладзевы цэнтр «Поспех» створаны пры падтрымцы дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) і камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама на базе 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі. Любы падлетак можа бясплатна, ананімна і канфідэнцыяльна атрымаць неабходную кансультацыю па хвалюючых асабістых, інтымных пытаннях.

Найбольш актуальныя з'явы — псіхалагічныя праблемы падлеткаў з бацькамі, аднагодкамі, настаўнікамі; падлеткавая цяжкарнасць; пытанні кантрацэпцыі і сэксуальна-палавога жыцця. Асноўны кантынгент наведвальнікаў — маладыя людзі ва ўзросце ад 13 да 18 гадоў. Звычайна ў дзень на індывідуальнае кансультаванне прыходзіць 6—8 чалавек. Але на тое і разлічана, каб атрыманая інфармацыя пайшла далей праз саміх дзяцей, паколькі равеснікі больш давяраюць адно аднаму. Таксама прыходзяць і бацькі. У асноўным — да псіхолага наконт праблем дзяцей у школе і дома.

У цэнтры арганізаваны штомесячныя клубы «Сяброўка» і «Рыцарскі клуб».

— На жаль, няма спецыяліста-андролага, — гаворыць педыятр Аксана Ніўчанка, — таму не хапае магчымасцяў удзяліць дастатковай увагі хлопчыкам.

Аднак і самі хлопчыкі — дужа рэдкія наведвальнікі. Бо па сваёй прыродзе мужчынскае насельніцтва адрозніваецца сарамлівасцю.

Не так даўно ў дзейнасць установы былі ўключаны трэнінгі па танцах. А зусім нядаўна ўведзена яшчэ і арт-тэрапія: па малюнках дзяцей вызначаецца сітуацыя ў сям'і, аналізуецца псіхічны стан.

Дзмітрый ФЕДЧАНКА, студэнт інстытута журналістыкі БДУ.

У АРГЕНЦІНЕ І ЧЫЛІ ХОЛАДНА НЕ БУДЗЕ

Уладзімір МОТУЗ, механік беларускай каманды на «Дакары-2009», дзеліцца сваімі назіраннямі

Два гады таму аматары ралі сталі сведкамі дэбюту беларускіх спартсменаў у легендарных спаборніцтвах па аўтаспорце «Лісабон — Дакар». У той час гэта быў інтэрнацыянальны беларуска-латышскі экіпаж, а задача была адна — проста прыйсці на фініш на Ружовым возеры. Летась з-за тэрарыстычных пагроз у Маўрытаніі ралі на тэрыторыі Афрыкі не праводзіліся ўвогуле.

І вось нарэшце — старт поўнасцю беларускага экіпажа на «Дакары-2009». Пілот Сяргей Шкель і штурман Аляксандр Тараненка спрабуюць пакарыць Лацінаамерыканскія раўніны і горы. Дапамагае ім у гэтым тэхнічная група ў складзе механіка-вадзіцеля Дзмітрыя Запарошчанка і механікаў Уладзіміра Мотуза і Аляксандра Нікончыка. Упершыню ў гісторыі «Дакар» адбываецца не ў Афрыцы па ўжо знаёмай прычыне неспрыяльных палітычных умоў у гэтым рэгіёне. Агульны працяг трасы амаль 10 000 кіламетраў, з якіх 5695 км — спецыялізаваныя адрэзкі. Удзел узялі 49 краін і 530 экіпажаў — прадстаўнікоў найбуйнейшых сусветных аўтамабільных канцэрнаў. Аб асаблівасцях «Дакара-2009», галодных абарыгенах і бяссонных начах падчас ралі распавёў механік нашай каманды Уладзімір МОТУЗ.

— Як вам перанос легендарных аўтамабільных спаборніцтваў у Амерыку?

— Звязана гэта не ў апошнюю чаргу з жаданнем арганізатараў да разнастайнасці. Згадзіцеся, калі чалавек на трасе ведае кожны паварот, ледзь не кожны каменьчык на дарозе, цікаўнасць будзе ўжо не такой. Ні ў якім разе не хачу прымяншаць магчымасці славутых пілотаў, аднак новы маршрут разбавіць нашы ўражанні, дадасць элемент непрадказальнасці. На мой погляд, будзе вельмі цікава.

— Два гады таму, перад дэбютам у «Дакары» вы не хавалі перажыванняў і вялі размову толькі аб тым, каб проста даехаць да фінішу. Што-небудзь змянілася цяпер?

— Сёння наш пілот Сяргей Шкель паўтарае гэтыя ж словы. Аднак ёсць ужо «прыцэл» на будучыню. Тое, як мы праехалі на Кубку свету, паказала, што мы можам змагацца, аўтамабіль дазваляе і Сяргей таксама добра падрыхтаваны. Загадваць не будзем, аднак вельмі хочацца пацягацца з тымі, хто заўсёды наперадзе.

— У першы дзень новага года ў вас была камісія...

— Звычайная тэхнічная камісія: спачатку адміністрацыйны кантроль каманды, праверка ўсіх неабходных папер пяці членаў экіпажу. Потым уласна кантроль тэхнічнага стану галоўнай машыны і «тэхнічкі». Затым баявы аўтамабіль адправіўся ў закрыты парк да самага старту...

— А як жа Новы год?..

— Ну, дадому ж заўсёды можна патэлефанаваць, павіншаваць родных і сяброў. А справіць... Год назад, напрыклад, мы прыехалі пасля цяжкай дарогі ў партугальскі Лісабон, дзе павінен быў быць дадзены старт. Толькі паставілі машыны ў боксы, як да нас падыходзяць хлопцы з расійскай каманды і кажуць: «Вы ўжо нікуды не трапіце, пад'язджайце да нас». Пакуль мы да іх дайшлі, да наступлення Новага года па нашым беларускім часе заставалася хвілін 5-6. Адкаркавалі бутэльку шампанскага, так і сустрэлі. Святы святамі, падзея прыемная, але праца ёсць праца.

— Падчас ралі вам дазваляецца карыстацца GPS-навігатарам — камп'ютарным памагатым на маршруце?

— Арганізатары сёлета будуць як і раней выдаваць GPS-навігатары. Пры гэтым ідзе чысты навігатар без «залітых» картаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЭКЗАМЕНЫ НА НОСЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Уключыце запіс, адрэгулюйце гук на самы ціхі і бярыцеся за падрыхтоўку. Прыродныя гукі дапамогуць адкінуць усе непрыемныя думкі і сканцэнтравацца толькі на тэксце кнігі ці канспекта. З такім суправаджэннем галава стамляецца менш. Праверана на сабе.

«Шакаладны» экзамен

У перыяды школьных экзаменаў і ўніверсітэцкіх сесій попыт на шакаладныя вырабы, напэўна, павялічваецца. Бо ў перыяд экзаменаў чамусьці адразу ўспамінаецца тое, што шакалад паляпшае памяць. Бацькі школьнікаў і студэнтаў з вялікімі сумкамі выпраўляюцца ў крамы па цукеркі і шакаладкі. Аднак медыцынскай даведкі аб тым, што шакалад дапамагае памяці, ніхто ніколі не бычыў. Нават, калі гэта так, не затрымлівайце бацькоў, а папрасіце іх купіць шакаладных цукерак абавязкова розных гатункаў, рознай формы, у каляровых, яркіх паперках. У перыяд падрыхтоўкі час ад часу запускайце руку ў сумку з салодкім і частуйцеся. Рознакаляровыя паперкі дапамогуць адпачыць вашым вачам, розныя па форме і смаку цукеркі адцягнуць на хвілінку вашу ўвагу ад падручнікаў, дадуць адпачыць галаве, а ўвогуле шакалад падсалодзіць жыццё і ўздыме настрой.

Слабінкі на хвілінку

У кожнага чалавека ёсць свае маленькія слабасці: хтосьці любіць глядзець серыялы, хтосьці — слухаць сімфанічную музыку, а камусьці падабаецца спаць з плюшавымі мядзведзікамі. Сесія — гэта асаблівы выпадак. Таму не адмаўляйце сабе ні ў чым: падчас перапынкаў у падрыхтоўцы пытанняў глядзіце свае любімыя серыялы, слухайце сімфанічную музыку, а ноччу кладзіце побач з сабой плюшавага мядзведзіка. Галоўнае ў сесію — быць у добрым настроі. Не пагрызеўшы наступную серыю любімай «мыльнай оперы», вы можаце сапсаваць яго. Аднак добрага — па крысе. Пастарайцеся любімымі заняткамі не перашкаджаць падрыхтоўцы, а наадварот — стымуляваць яе.

Салодкага сну

«Вучыць у сесію па начах — глупства», — так не раз паўтараў адзін мой выкладчык. Некалькі «вучоных» начэй, пасля якіх я не памятала ніводнага слова з прачытанага, пераканалі мяне ў гэтым.

Сон у сесію павінен быць самым моцным і салодкім. Для гэтага ў перыяд падрыхтоўкі да экзаменаў кожны дзень кладзіцеся ў адзін і той жа час і думайце толькі пра прыемнае. Каля падушкі можна пакласці закручаную ў хустачку духмяную сухую траву: рамонкі, чабарок. Раніцай вы прачняцеся з новымі сіламі і з добрым настроем.

Жанна БАЙГОТ, студэнтка ГрДУ імя Я. Купалы.

У АРГЕНЦІНЕ І ЧЫЛІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Ёсць легенда, звычайныя карты і навігатар — тры рэчы, без якіх не абысціся. Хоць не ўсё так проста, як можа здацца на першы погляд. Напрыклад, на «Дакары-2007» у нашай «тэхнічкі» быў арыенцір — праз 30 км у пустыні пакрышка. І вось калі на спідометры лічба набліжаецца да 28-29 км, ноч, цемра навокал, то становіцца зусім нярадасна — дзе ж тая пакрышка, па якую трэба будзе звярнуць направа?

— А як у вас з бытавымі дробязямі? Дзе ў вас начлег пасля штодзённых 600-кіламетровых прабегаў?

— Прыязду прыклад. Сёння ў нас старт — кропка «А». Баявы аўтамабіль рухаецца па свайм маршруце і ў большасці выпадкаў з нашым аўтамабілем, «тэхнічкай», не перасякаецца, пакуль не прыбудзе ў кропку «Б». У іх ёсць спецыяльныя адрэзкі з цяжкімі ўмовамі, а ў нас можа быць больш працяглай дарога. І наша задача — прыбыць раней за галоўную машыну. Разбіць лагер, падрыхтаваць працоўнае месца для абслугоўвання машыны і, калі атрымаецца, крышачку паесці і паспаць.

Потым прыязджае баявы аўтамабіль. Для пілота — душ, вячэра, брыфінг і адпачываць. Мы ж, механікі, ноччу, у залежнасці ад таго, што здарылася з аўтамабілем за дзень, рыхтуем яго да наступнага этапа. Калі няспраўнасцяў мала, у нас з'яўляецца магчымасць добра пад'есці і паспаць. А калі не... На мінулым «Дакары», напрыклад, я для сябе ўвогуле не запомніў краіну Малі (Афрыка), таму што якраз было шмат працы над машынай. І вось раніцай вадзіцель «тэхнічкі» за руль — яму ехаць за дзень ад 300 да 1000 км. А я надзяваю шлем і, седзячы, шукаю магчымасці «пакімарыць» да наступнага прыпынку. Вось так Малі і праехаў.

— На гэты раз будзе адрэзак, які знаходзіцца ў высакагор'і. Кажуць, замест звычайнага давядзецца ўжываць авіяцыйнае паліва. Якія могуць узнікнуць праблемы ў гэтых умовах?

— Гэта будзе мяжа паміж Аргенцінай і Чылі ў Андах. Для нас — дзень адпачынку, а для пілотаў — вельмі складаныя ўмовы. Мы доўга смяяліся, калі ўбачылі, што гэты спецадрэзак працягваецца роўна 666 кіламетраў і запланаваны на 13 студзеня. Добра хоць, што не на пятніцу...

А праблемы могуць узнікнуць на любым этапе з-за маленькага шрубчыка, які возьме ды адкруціцца і куды-небудзь не туды закоціцца. Калі думаць аб тым, што можа здарыцца нешта дрэннае, лепей увогуле нічога не пачынаць.

— А як да вас ставіцца мясцовае насельніцтва падчас ралі?

— Пра Лацінскую Амерыку пакуль што рана казаць. З мінулага ж можна заўважыць, што Заходняя Афрыка — гэта краіна з вельмі нізкім узроўнем жыцця. Таму і насельніцтва там разглядае «Дакар» як сродак да існавання. Здарылася, прыходзілі і прасілі што-небудзь. А калі не дасі — папросту могуць і скрасці. Туніс і Лівія — больш багатыя краіны. І там з мясцовым насельніцтвам было прыемна мець стасункі. На запраўку завітваеш і адчуваеш сябе значна спакайней. Насамрэч, цяжка гэта перадаць словамі — Афрыку трэба бачыць.

— Уладзімір, што ўваходзіць у сферу вашай дзейнасці акрамя ўдзелу ў «Дакары»?

— «Дакар-2009» — гэта ўсяго толькі сезонны этап. Я ўдзельнічаю ў трофі-рэйдах у якасці штурмана. Таксама рыхтуем машыну для ўдзелу, калі ўсё будзе добра, у гонцы «Беларусь Баха». Такім чынам атрымліваецца, што жыву аўтаспортам амаль круглы год. І пакуль што не надакучвае, таму што з самага дзяцінства падабалася «калупацца» ў машынах.

Юрась ШАЎЦОЎ.

ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС І КАШАЛЁК СТУДЭНТА

...І да моладзі дакацілася хваля крызісу. Студэнты, занятыя падрыхтоўкай да сесіі і здачай «хвастоў», вядома, жывуць не толькі ведамі. Есці, добра выглядаць, хадзіць у кінатэатр ці неяк паіншаму культурна бавіць час — нармальныя жаданні сяроднястатыстычнага студэнта. А калі фінансы, як у вядомай песні, «спяваюць рамансы», дужа нікуды не находзішся. Да таго ж, стыпендыю зараз атрымлівае хутчэй меншасць, і таму грашовы бок крызіснага пытання амаль цалкам ускладаецца на плечы бацькоў.

Нават «шчасліўцы», у якіх усё-такі стыпендыя ёсць, растрачваюць яе, як правіла, у рэкордна хуткі час. З асабістага досведу: добра, калі ўласныя грошы расцягваюцца на тыдзень. Гэта — у лепшым выпадку. Бо запатрабаванні пастаянна павялічваюцца, а разам з імі — цэны. Апошнім часам я трапляю ў сітуацыі, калі трымаю ў руках стыпендыю і не ведаю, што набыць, каб было не крыўдна за патрачаныя грошы. Калі «накарміць» халадзільнік хаця б на тыдзень (пачынаючы з паўсядзённых макаронаў, алею, прыпраў і заканчваючы любімымі вафлямі), то грошай застанецца якраз на праезд да факультэта (спачатку на аўтобусе — талончык, потым на тралейбусе — талончык, потым такім жа шляхам назад). Але ў мяне ж скончыўся шампунь (гель-душ, тонік, крэм, лак...). Жаночая палова насельніцтва мяне зразумее, бо касметыка мае цудоўную якасць — знікаць у самы непадыходны момант. А калі купіш неабходную касметыку ці вось тую блакітную кофтачку, якая так пасуе да вачэй, — рызыкуеш застацца без ежы і з тымі ж «якраз на праезд». Да таго ж, так не хочацца зноў турбаваць маці з просьбай «дапамагчы фінансава, бо тваё дзіцё тут памірае без ежы і ходзіць з раскудлачанымі без лаку валасамі»... Матуля, само сабой, дапаможа. І нават не спытае, куды падзеліся мае ўласныя грошы. Зразумела ж: вялікі горад — вялікія патрэбы...

Відавочна, што адбіццё крызісу на ўласным кашальку заўважыла не адна я. А каб даведацца, як закранае ён маіх калег-студэнтаў і ў чым гэта праяўляецца, я задала некаторым з іх заканамерное пытанне: «Ці адчуваеце вы на сабе ўплыў фінансавага крызісу?». Адказы атрымаліся наступныя:

Алена СТУДНЁВА, 21 (Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання, эканамічны факультэт): «Не ведаю дакладна, ці звязана гэта з крызісам, але тое, што цэны паступова павялічваюцца, заўважыла. Гэта не катастрафічныя сумы, але лішнія 300—500 рублёў не заўсёды бываюць у кішэні. Да таго ж, я не атрымліваю стыпендыю, таму пра грашовыя лішкі размаўляць не даводзіцца. І што тычыцца асабіста мяне, мяркую, крызіс адчуваецца перш за ўсё ў перыядычным павышэнні аплаты за навучанне».

Алена ДРАПКО, 19 (БДУ, Інстытут журналістыкі): «На мяне фінансавы крызіс амаль што не ўплывае. Гэта звязана перш за ўсё з тым, што я сама не зарабляю грошы і магу бачыць змены, толькі арыентуючыся па павышэннях ці паніжэннях цэнаў. Зберажэнняў у банках ці свайго бізнэсу ў мяне няма, таму, калі ў кагосьці не скончыцца паспяхова фінансавая аперацыя, я ад гэтага не пацярплю. Але калі ў людзей наладжаны свой бізнэс і там задзейнічаны ўласны капітал, то на іх крызіс, напэўна, адбіваецца самым непасрэдным чынам».

Аляксандр ЦІТАВЕЦ, 20 (Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога, энергетычны факультэт): «Я цалкам фінансава залежу ад сваіх бацькоў. Таму крызісу на сабе не адчуваю. Мабыць, калі б у мяне былі ўласныя грошы, гэта было б лепш заўважна. Але, наколькі я ведаю, цяжэй цяпер недзяржаўным установам. Іх персаналу ў некаторых выпадках нават зніжаюць зарплату. Мне ж як студэнту гэта пакуль што не пагражае».

Ірына ЗУЁНАК, 21 (БДУ, біялагічны факультэт): «Фінансавы крызіс? Напэўна, на мне ён не адбіваецца. Я яшчэ вучуся, таму грошы мне даюць бацькі. Сума, якую яны выдзялялі год таму і якую выдаюць зараз, засталася прыкладна той жа. Цэны, праўда, крыху павялічваюцца, але ж яны заўсёды растуць на працягу кожнага года».

Жанна МЕЛЯШКЕВІЧ, 20 (БДУ, Інстытут журналістыкі): «Вядома, адчуваю! Я атрымліваю стыпендыю 120 тысяч беларускіх рублёў. І калі яшчэ летась мне хапала гэтых грошай прыкладна на тыдзень, калі траціць іх на неабходныя рэчы, то зараз гэты тэрмін — тры-чатыры дні. Цэны на харчовыя прадукты растуць, а мая стыпендыя не павялічваецца. Вось і даводзіцца ў чарговы раз звяртацца да бацькоў, у якіх, акрамя маіх турботаў, сваіх фінансавых праблемаў хапае...»

Юрый ЦУБАТАЎ, 20 (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, факультэт фізічнай культуры): «На мяне, як і на ўсіх маіх сяброў, крызіс так ці інакш уплывае. Цэны растуць, тарыфная стаўка знізілася... Пакуль жа ўсё больш-менш спакойна: стыпендыі не адмяняюць...

Зразумела, што на кожнае пытанне існыя мноства варыянтаў адказу. Крызіс — з'ява не аднаго дня, і меркаванне наконт яго вынікаў фарміруецца вельмі доўга. Цешыць той факт, што студэнты не абыкаюць да гэтай праблемы. А наконт маёй новай блакітнай кофтачкі... Відаць, давядзецца зноў патурбаваць матулю».

Таццяна КАВАЛЁВА.

РУБЕЛЬ УМАЦАВАЎСЯ ДА ДОЛАРА: «АМЕРЫКАНЕЦ» ПАТАННЕЎ НА 10 РУБЛЁЎ

Грошы: па чутках і аўтарытэтна

Пачатак года — багаты на мноства чутак, звязаных з грашыма. Першынство тут — усё тое, што датычацца дэнамінацыі беларускага рубля. Калі верыць ім, то прынамсі з учарашняга дня галоўны банк ужо павінен быў бы аб'явіць аб ёй. Тым не менш пакуль у абарачэнні па-ранейшаму знаходзяцца банкноты, якія хадзілі да гэтага.

— Калі будзе дэнамінацыя, аб ёй і аб'явяць, — каментуе сітуацыю **прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.** — А вось кожны дзень абвяргаць падобныя чуткі — у нас такога намеру няма. Спачатку казалі пра тое, што дэнамінацыя адбудзецца 1 студзеня, потым — 6, 7, 8 студзеня. Як бачыце, пакуль ніякай дэнамінацыі няма.

— А як вы пракаментуеце чуткі наконт таго, што курс нацыянальнай валюты быў істотна зніжаны з мэтай пераходу на расійскі рубель у якасці адзінага плацежнага сродку? Маўляў, пасля зніжэння курсу з наступнай дэнамінацыяй курсы беларускага рубля і расійскага выраўняюцца ў адносінах да сусветных валют?

— Не трэба звязваць карэкціроўку курсу нашай нацыянальнай валюты з пытаннем аб увядзенні расійскага рубля ў якасці адзінай валюты Саюзнай дзяржавы. Калі зніжаліся курсы нацыянальных валют у краінах, якія з'яўляюцца асноўнымі гандлёвымі партнёрамі нашай рэспублікі, такая карэкціроўка з'яўлялася непазбежнай. Узгадаю, напрыклад, што ў Расіі з пачатку жніўня мінулага года да пачатку гэтага курс расійскага рубля да долара ЗША быў зніжаны на 25,5 працэнта, курс украінскай грыўні — на 59 працэнтаў. Такое значнае аслабленне гэтых валют у адносінах да долара і прывязанаму да яго летась беларускаму рублю, а таксама іншыя наступствы сусветнага крызісу негатыўна паўплывалі на канкурэнтаздольнасць беларускай прадукцыі і адпаведна на тэмпы эканамічнага росту і ўзровень даходаў грамадзян.

— Эксперт нашай газеты, аналізуючы праведзеную карэкціроўку курсу, зазначыў, што зроблена яна была прафесійна, і апроч усяго дазволіла пазбегнуць вялікага адтоку рублёвых укладаў.

— Разавы характар зробленай карэкціроўкі курсу беларускага рубля да замежных валют быў абумоўлены неабходнасцю неадкладнага рэагавання на сітуацыю, пра якую я ўзгадваў вышэй, а таксама мэтазгоднасцю папярэдзіць павышаны попыт на замежную валюту, які назіраецца пры марудным і відавочным зніжэнні курсу. У выніку новы дзейны ўзровень курсу забяспечвае дастатковую канкурэнтаздольнасць беларускага экспарту, рост попыту на прадукцыю айчынных прадпрыемстваў і з'яўляецца надзейнай гарантыяй ад наступных карэкціровак.

— З пачаткам дзеяння новага механізма прывязкі курсу рубля да кошыка замежных валют не ўсе зразумелі, што ж насамрэч адбылося. Як гэта, напрыклад, будзе ўплываць на той жа курс нацыянальнай валюты да долара ЗША?

— Пры выкарыстанні новага механізма будзе забяспечвацца агульная стабільнасць курсу беларускага рубля да кошыка замежных валют — долара ЗША, еўра, расійскага рубля. З пачатку новаўвядзення рублёвы кошт кошыка — курс беларускага рубля ў адносінах да кошыка — склаў 960 рублёў, што з'яўлялася сярэдняй геаметрычнай велічынёй двухбаковых курсаў: 2650 беларускіх рублёў за долар ЗША, 3703 — за еўра, 90,16 — за расійскі рубель. Цяпер зніжэнне курса нашай валюты да адной з валют кошыка можа адбывацца пры яе ўзмацненні на сусветным рынку і будзе кампенсавацца ўмацаваннем беларускага рубля да іншых замежных валют. Паглядзіце, што адбылося ў першы працоўны дзень новага года: на сусветным валютным рынку курс долара вырас у адносінах да еўра. Таму курс беларускага рубля некалькі знізіўся ў адносінах да долара, але адначасова ўмацаваўся да еўра.

— Учора курс долара наадварот крыху знізіўся.

— Практыка сведчыць, што за кароткі час тэндэнцыя можа памяняцца на супрацьлеглую. Прывязка курсу да кошыка замежных валют фактычна азначае, што атрымаць выгаду за кошт росту курса адной з замежных валют — марныя спробы: іх хістанні могуць адбывацца ў абодва бакі, хутка змяняцца. А вось кошт кошыка валют будзе заставацца стабільным. Сёлета дапускаюцца яго хістанні ў межах плюс-мінус 5 працэнтаў у залежнасці ад суадносінаў попыту і прапановы валюты на ўнутраным рынку і іншых фактараў.

— Тым не менш цяпер назіраецца павышаны попыт на наяўную валюту ў пунктах абмену валюты: не ўсе «абменнікі» ў стане задаволіць «апетыты» пакупнікоў.

— Пункты абмену валюты падмацоўваюцца валютай, аднак яе не хапае з-за ажыятажнага попыту. На жаль, насельніцтва не разумее таго, што ў выніку яно губляе сёння ад канвертацыі больш, чым набывае. Напрыклад, курс нацыянальнай валюты да долара ЗША на апошніх таргах Беларускай валютна-фондавай біржы ўмацаваўся і склаў 2645 рублёў замест ранейшых 2655. Значыць, і ў абменніках долар таксама патаннее.

Паводле апошніх звестак упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні скараціліся за мінулы год на 1330,5 мільёна долараў, ці на 26,6 працэнта — да 3662,2 мільёна долараў. За апошні месяц 2008 года яны зменшыліся на 19,4 працэнта — на 882,1 мільёна долараў. Золатавалютныя рэзервы, адзначылі ў галоўным банку, зменшыліся ў выніку пагаршэння плацежнага балансу краіны, а таксама аперацый, што праводзіліся Нацыянальным банкам на валютным рынку. Як мяркуецца, да канца гэтага года золатавалютныя рэзервы будуць знаходзіцца ў межах 8—10 млрд долараў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Даходнасць зберажэнняў павышаецца

Шэраг беларускіх банкаў пасля павышэння стаўкі рэфінансавання да 14 працэнтаў гадавых аб'явілі аб росце і працэнтных ставак па дэпазітах. У прыватнасці, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар ААТ «ААБ Беларусбанк» Сяргей Верашчак, банк прыняў рашэнне аб павышэнні з 1 студзеня сярэдняга ўзроўню даходнасці па ўкладах у нацыянальнай валюце да 20,5-21 працэнта гадавых.

Прычым летась гэты паказчык складаў 16 працэнтаў гадавых. Як адзначаюць у «Беларусбанку», цяпер разглядаецца таксама і пытанне па змяненні ставак па валютных дэпазітах. Акрамя таго, у банку збіраюцца сёлета ўвесці новы від зберажэнняў — мультывалютны ўклад. Гэта значыць, што людзі змогуць самі выбраць, якую валюту пакласці на дэпазіт — беларускія рублі, долары ці еўра, а таксама кіраваць сваім рахункам: да прыкладу, праводзіць канверсійныя аперацыі без страты даходнасці. Таксама на ўкладзе можна будзе захоўваць сродкі адразу ў трох валютах.

6 МЛН КВ. МЕТРАЎ ЖЫЛЛЯ Ў 2009-м — ЗАДАЧА ВЫРАШАЛЬНАЯ

Будаўніцтва жылля для «чаргавікоў» сёлета можа падаражэць прыкладна на 15—16 працэнтаў?

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.

— У час фінансавага крызісу многія краіны Еўропы пачынаюць пераглядаць свае сацыяльна-эканамічныя планы ў бок згортвання. Пасля вядомых падзей з валютай у новым годзе чытачы нашага выдання пачалі больш актыўна цікавіцца перспектывамі будаўнічай галіны. З якім настроем спецыялісты міністэрства глядзяць у будучыню? Які аб'ём жылля ў нашай краіне будзе пабудаваны сёлета, у тым ліку для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў?

— Настрой у будаўнікоў сур'ёзны. Сёлета ў краіне неабходна пабудаваць не менш як 6 млн квадратных метраў жылля. Па лініі шматкватэрных дамоў 78 працэнтаў кватэр неабходна пабудаваць сёлета менавіта для «чаргавікоў».

— У апошнія часы сярод жыхароў сталіцы пачалі гуляць чуткі аб магчымым замарожванні пэўных жыллёвых праграм... Удакладніце, ці будуць вытрымлівацца сёлета запланаваныя аб'ёмы будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў?

— Сёлета аб'ёмы будаўніцтва жылля для гэтай сацыяльнай катэгорыі нават павялічаныя на 50 працэнтаў у параўнанні з 2008 годам. Праблема жылля для шматдзетных сем'яў будзе вырашацца сёлета ў першую чаргу.

— Ці будзе забяспечвацца будаўніцтва жылля для «чаргавікоў» неабходным фінансаваннем? Вядома, што шматдзетныя сем'і за ўласныя грошы будаваць не змогуць...

— На сёння фінансаванне па лініі дзяржаўнай падтрымкі будаўніцтва для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у бюджэце краіны вызначана. Гэта грашовыя сродкі ў памеры 3,8 трлн рублёў крэдытных рэсурсаў, якіх, паводле разлікаў на снежань мінулага года ў дзеючых цэнах, павінна хапіць для льготнага крэдытавання ўсіх катэгорый «чаргавікоў», у тым ліку і па лініі шматдзетных сем'яў.

— Ці застанецца сёлета дзейнічаць механізм сапраўды маленькіх працэнтаў па жыллёвых крэдытах для льготных катэгорый насельніцтва?

— Для шматдзетных сем'яў, а таксама чаргавікоў у населеных пунктах да 20 тысяч чалавек выдаецца льготны крэдыт — з разліку на 95 працэнтаў «нарматыўных» 20 квадратных метраў агульнай плошчы на чалавека, тэрмінам да 40 гадоў пад 3 працэнты гадавых. Для чаргавікоў у населеных пунктах больш за 20 тысяч чалавек на льготных умовах можа быць прадастаўлена 90 працэнтаў нарматыўнай жылплошчы з тэрмінам крэдыту 20 гадоў пад 5 працэнтаў гадавых. Гэтыя крэдыты павінны дзейнічаць і сёлета. Мы ніякіх рашэнняў па названых крэдытах не рыхтавалі.

Што датычыцца крэдытаў для чаргавікоў на агульных падставах, то да апошняга часу яны былі пад 15 працэнтаў гадавых, калі маржа банкаў складала 3 працэнты. З 8 студзеня стаўка рэфінансавання павышана да 14 працэнтаў. Магчыма, крэдыты пад будаўніцтва жылля для чаргавікоў на агульных падставах будуць ужо каштаваць 17 працэнтаў гадавых.

— Якім будзе кошт квадратнага метра жылля для чаргавікоў сёлета?

— Гэта вельмі складанае пытанне. Пакуль мы можам казаць толькі аб тым, што кошт жылля будзе зыходзіць з росту сяродняга індэкса будаўніча-мантажных работ, які цяпер зацверджаны ў памеры 115—116 працэнтаў. Калі гэты індэкс будзе павялічвацца такімі тэмпамі, то на працягу 2009 года будаўніцтва жылля падаражэе прыкладна на 15—16 працэнтаў. Разам з тым, магчыма, на кошт квадратнага метра паўплывае павелічэнне стаўкі рэфінансавання і новая цана на расійскі газ. Аб тым, як дакладна новыя эканамічныя ўмовы паўплываюць на жыллёвы сектар, мы даведаемся не раней чым праз месяц. Апошняя цана квадратнага метра жылля па лініі стандартных буйнапанэльных дамоў летась склала 1,1 мільёна рублёў, маналітных і цагляных дамоў — адпаведна 1,3 і 1,4 мільёна рублёў.

— Ці магчыма нейкая карэкціроўка цаны будаўніцтва квадратнага метра жылля ў сувязі з павелічэннем кошту кошыка замежных валют?

— Для вытворчасці пэўных будаўнічых матэрыялаў выкарыстоўваюцца і імпартныя камплектуючыя за расійскія рублі ці за долары. Нейкім чынам кошт гэтых імпартных пазіцый можа адбіцца на агульнай цане будаўніцтва жылля. У першую чаргу гэта датычыцца кошту прыроднага газу, які выкарыстоўваецца пры вытворчасці цэменту.

— Як, на ваш погляд, 20-працэнтная дэвальвацыя беларускага рубля можа паўплываць на развіццё долевага будаўніцтва?

— Памяншэнне пакупной здольнасці насельніцтва памяншае попыт на першасным рынку жылля. У асобных забудоўшчыкаў па лініі долевага будаўніцтва могуць узнікнуць праблемы, калі кліенты будуць адмаўляцца плаціць па чарговых плацяжах. З-за фінансавых цяжкасцяў камерцыйных арганізацый, якія займаюцца долевым будаўніцтвам, пэўныя новабудоўлі могуць быць нават замарожаныя ўжо на этапе прыцягвання дольшчыкаў. У выніку агульны аб'ём будаўніцтва жылля па лініі долевага будаўніцтва сёлета можа істотна скараціцца.

Сяргей КУРКАЧ.

АБВАЛ ЦЭНАЎ НА ЖЫЛЛЁ?

З першых працоўных дзён новага года другасны рынак сталічнага жылля трапіў у зону нулявога попыту і максімальнай прапановы. Паводле інфармацыі інтэрнэт-парталаў, у пачатку студзеня колькасць прапаноў жыллёвых аб'ектаў на продаж у Мінску павялічылася да 9,5 тысяч кватэр.

Дырэктар Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ адзначае, што асноўная колькасць прадаўцоў спадзяецца прадаць свае нерухомасць яшчэ па леташнім кошце. Разам з тым, пры рэальных здзелках прадаўцы згодныя прапанаваць пакупнікам скідкі не ў памеры 2—3 тысяч долараў — гаворка часам можа ісці аб знижэнні першапачатковага кошту адразу на 5—10 тысяч USD. У агенцтвах нерухомасці пачалі з'яўляцца кватэры, кошт квадратнага метра ў якіх патанней адразу на 200—300 пунктаў і складае 1520—1580 долараў. На другасным рынку жыллёвай нерухомасці сёння існуе ўжо нямала такіх танных кватэр. Такое жыллё прадаўцы спрабуюць прадаць тэрмінова за некалькі дзён і выключна за наяўную валюту. Зусім маленькія аднапакаёвыя кватэры ў старых дамах-«хрушчоўках» з агульнай плошчай да 33 кв.м пачалі выстаўляцца па цэнніку каля 50 тысяч долараў.

Эксперты другаснага рынку нерухомасці адзначаюць, што кропкавае істотнае зніжэнне цэнаў на жыллё мае вельмі кароткачасовы характар і звязана з інтарэсамі невялікай колькасці прадаўцоў, якім цяпер вельмі патрэбны грошы. Аб памерах сапраўднай тэндэнцыі на патанненне жылля можна будзе казаць толькі праз некалькі тыдняў, калі, магчыма, спадзе ажыятажны попыт на наяўную валюту або калі банкі зноў пачнуць крэдытаваць насельніцтва па лініі набыцця кватэр на другасным рынку жылля.

Сяргей ПАЛІНІН.

ХАБАР — БУДМАТЭРЫЯЛАМІ?

Пракуратурай Цэнтральнага раёна Гомеля па матэрыялах падраздзялення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнай злачыннасцю УУС і РАУС узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да адказнай асобы аднаго з філіялаў Цэнтральнай гарадской паліклінікі. 48-гадовая жанчына падазраецца ў тым, што ў красавіку пазамінулага года атрымала ад дырэктара будаўнічай фірмы хабар у выглядзе будаўнічых матэрыялаў і паслуг па рамонце яе кватэры. За гэта яна, як мяркуецца, станоўча вырашыла пытанне аб падпісанні акта прыёмкі па выкананых рамонтна-будаўнічых работах фірмы на філіяле.

Ігар ГРЫШЫН.

МІЛЬЁНЫ ІНЖЫНЕРА

У Віцебску папярэднім расследаваннем Першамайскага РАУС узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да 26-гадовага мясцовага жыхара, які зараз нідзе не працуе, а раней займаў адказную пасаду на РУВП «Віцязь». Па яго дзейнасці ў той час у праваахоўнікаў і з'явіліся «прэтэнзіі». У прыватнасці, падазраецца мужчына ў тым, што працуючы інжынерам аднаго з аддзелаў, са жніўня 2006 па красавік 2007 года ён учыніў крадзеж 24 мільёнаў 900 тысяч рублёў.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

СЕМ ЦУДАЎ ПРЫРОДЫ МІНШЧЫНЫ

У інтэрнэце стартавала кампанія па выбары сямі цудаў прыроды свету. У спіс патрапілі самыя вядомыя азёры, горы, вадаспады, пячоры — такія, як Вялікі каньён, Эверэст, Ніягарскі вадаспад. Таксама ў спісе фігуруе і наша Белавежская пушча.

Тым часам на афіцыйным інтэрнэт-сайце Мінскага абласнога камітэта ГА «БРСМ» стартаваў абласны праект «Сем цудаў прыроды Міншчыны». Мэтай акцыі з'яўляецца далучэнне моладзі да традыцый, культуры і прыроднай спадчыны свайго народа. Праект праходзіць у два этапы.

На першым этапе тэрытарыяльныя камітэты падавалі ў абкам БРСМ фота з кароткім апісаннем найбольш цікавых помнікаў прыроды — намінантаў. Як адзначылі ў прэс-цэнтры маладзёжнай арганізацыі, цяпер на сайце размешчаныя 34 фотаработы з усёй Міншчыны.

Другі этап — гэта непасрэднае галасаванне за «Сем цудаў прыроды Міншчыны», яно будзе доўжыцца па 13 лютага 2009 года. Госці сайта brsmOK.by могуць прагаласаваць за той або іншы аб'ект, які ацэньваецца па шкале ад 1 да 5.

Пераможцы будуць вызначаныя 14 лютага 2009 года, аўтары лепшых фотаработ атрымаюць спецыяльныя прызы ад Мінскай абласной арганізацыі БРСМ.

Таксама па выніках акцыі будзе распрацаваны турыстычны маршрут па культурных, турыстычных і прыродных аб'ектах Мінскай вобласці.

Кар. «ЧЗ».

БЫКІ ТАКІЯ РОЗНЫЯ...

Быкі з... СД-дыскаў, з гліны, пластыліну дэманструюцца на выставе дзіцячай творчасці ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. Ёсць тут бык «беларус», з гальштукам і на веласіпедзе... Па добрай традыцыі тут у святочныя дні ажыццяўляюцца такія праекты, прысвечаныя сімвалу чарговага года. Сёлета можна ўбачыць творы больш за 100 аўтараў ва ўзросце ад 11 да 14 гадоў з віцебскай дзіцячай мастацкай школе № 1.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«УЗРОСТАВАЯ ПЛАНКА...»

ПЕНСІІ «АБГОНЯЦЬ» ІНФЛЯЦЫЮ

Летась працоўныя пенсіі пераразлічваліся з 1 лютага і 1 жніўня. Колькі будзе павышэнняў сёлета, яшчэ невядома — як адзначыла **намеснік міністра Валянціна КАРАЛЁВА,** тут усё будзе залежаць ад тэмпаў змянення зарплаты. Разам з тым, у міністэрстве прагназуюць, што **ў 2009 годзе сярэдняя пенсія па ўзросце павялічыцца на 14 працэнтаў у рэальным вымярэнні.** Інакш кажучы, менавіта на столькі вза апярэдзіць рост цэнаў на тавары і паслугі.

Не менш адметнай асаблівасцю новага года стане ўвядзенне прафесійных страхавых пенсій. Яго сэнс у тым, што ўсе датэрміновыя пенсіі стануць аплачвацца не з агульнага фонду, а за кошт мэтавых дадатковых узносаў працадаўцаў. Паводле слоў Валянціны Каралёвай, гэта дазволіць аптымізаваць выдаткі пенсійнай сістэмы, палепшыць яе фінансавы стан, а з цягам часу — дасць новыя магчымасці для павышэння пенсій.

Пэўныя рэсурсы для пенсійнай сістэмы дае і павышэнне пенсійнага ўзросту. Такі крок, дзякуючы зніжэнню сацыяльных адлічэнняў, прынёс бы палёгку суб'ектам гаспадарання. І, з улікам дэмаграфічных рэалій, ён дазволіў бы падтрымаць на належным узроўні непасрэдна памеры пенсій. Аднак, падкрэсліла Валянціна Каралёва, пакуль ніякіх зменаў тут не адбудзецца, сёлета ранейшы пенсійны ўзрост дакладна застанецца. Прычым у будучыні, калі адпаведнае рашэнне ўсё ж можа быць прынята, у любым выпадку рэформа не пройдзе ў адзін момант, прымальным будзе толькі варыянт паступовага зруху «ўзроставай планкі» — скажам, на тры месяцы або на паўгода.

Тым больш, зазначыла намеснік міністра, у найбліжэйшай перспектыве няма намеру пераходзіць на накапляльную пенсійную сістэму. У шэрагу краін, якія пайшлі гэтым шляхам, пенсійныя сродкі паступова абясцэньваліся і ў дакрызісныя часы. Сёння ж падобная рызыка ўзрастае ў шмат разоў.

Сяргей ГРЫБ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СВІНЕЦ ЛЬЕЦЦА

У сераду днём, Ізраіль упершыню за 12 дзён аперацыі абвясціў трохгадзіннае спыненне агню, каб забяспечыць дастаўку ў сектар Газа гуманітарнай дапамогі і эвакуацыю раненых. Пасля перапынку баі аперацыі «Літы свінец» аднавіліся. Як паведаміў кіраўнік службаў неадкладнай дапамогі сектара Газа, колькасць ахвяраў ваеннай аперацыі, якую праводзіць Ізраіль у сектары Газа, перавысіла 700 чалавек, прычым па меншай меры 220 з іх — дзеці. Колькасць параненых ён ацаніў у больш за 3100 чалавек. Ізраільскае войска страціла сем вайскоўцаў. Учора Ізраіль быў падвергнуты ракетнаму абстрэлу з боку Лівана — чатыры ракеты ўпалі ў раёне горада Нагарыя на поўначы Ізраіля. У выніку абстрэлу паранена некалькі чалавек. У адказ ізраільскае войска нанесла ўдар па Ліване. У гэтай краіне, нагадаем, базуецца радыкальная шыіцкая групоўка «Хізбала», якая карыстаецца падтрымкай уладаў Ірана. Прэм'ер Ізраіля Эхуд Ольмерт не выключыў, што вайна будзе весціся да звяржэння ўлады ХАМАС на тэрыторыі Газа.

ГАЗ НЕ І

НА ХУТАРЫ?

Так называўся матэрыял у «Звяздзе» ад 24 снежня мінулага года, у якім першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Надзея КАТКАВЕЦ расказала пра тое, што міністэрства прапрацоўвае пытанне аб стварэнні ў сельскай мясцовасці хутароў. Размова ішла і пра падтрымку, якую дзяржава мяркуе аказаць тым, хто стане хутаранамі. Чытачы «Звязды» актыўна адгукнуліся на публікацыю, прыслалі свае меркаванні і прапановы. Частку з іх друкуем сёння, працяг размовы — у наступных нумарах газеты. Чакаем новых лістоў на надзённую тэму — уладкавання РОДНАЙ ЗЯМЛІ. І, магчыма, памяняем знак прыпынку ў загалоўку папярэдняй публікацыі — НА ХУТАРЫ!

У гаях вішнёвых тонуць хутары...

Ты знаешь край, где все обильем дышит,
Где реки льются чище серебра,
Где ветерок степной ковыль колышет,
В вишневых рощах тонут хутора.

Баюся памыліцца, хто аўтар гэтых чароўных радкоў (А.К. Талстой — **рэд.**), але ў іх — такое сугучча гармоніі і надзеі, чысціні і дабрадзенства. Радкі ўзгадаліся, калі чытаў у «Звяздзе» артыкул «На хутары?» Не, гэта зусім не выдумка Сталыпіна, як хто-ніхто лічыць, хутары існавалі здавён у Еўропе. Чалавеку ўтульна і зручна ў вялікай грамадзе падчас вяселля, гуляння альбо ў кароткачасовай сумеснай працы — у талацэ, напрыклад. А ў паўсядзённым жыцці чалавеку лепш мерна і ўдумліва працаваць сваёй сям'ёй, раднёй, асэнсоўваць свой побыт, размяркоўваць вынікі сваёй працы паводле свайго разумення. А то часта агульная дзяльба вядзецца па законах воўчай зграі — хто мацнейшы, таму і лепшы кавалак. Пры хутарской сістэме вынікі працы належаць працаўніку.

Хутары, фальваркі, адрубы, а затым і «неперспектыўныя вёскі» былі ліквідаваныя, на маю думку, для таго, каб зручней было адсочваць паводзіны людзей. Калгасна-саўгасная сістэма, пабудаваная на задушэнні ўласніцкіх, гаспадарскіх імкненняў, часам не развівала калектывісцкія пачаткі, а насаджала адзінаўладдзе старшыні калгаса пры маўклівым прафсаюзе, кішэннай бухгалтэрыі ды яшчэ парткаме, які пільна сачыў за шкоднымі думкамі ў галовах. Што карыснага, скажыце, рабілі апошнія? А атрымлівалі напоўніцу. Лепш жылося не тым, хто арэ і доіць, а тым, хто набліжаны да калгаснага свірна.

Усё гэта не магло не адбіцца на вёсцы. Хутароў і іх гаспадароў няма, вёскі імкліва знікаюць без вайны і ворагаў. Людзі збеглі ў горад ад несправядлівасці і цяжкай працы, вынікі якой даставаліся не ім. Вось і дакаціліся — поля шмат, а працаваць на ім няма каму. Лічу, што не парабак-калгаснік адродзіць зямлю, а яе ўласнік, гаспадар. Зямля — гэта жывы арганізм, яна аддасць сваю сілу таму, хто яе разумее, любіць, нават песціць. Цяжкая гэта праца, не аднаго дзесяцігоддзя, але іншага шляху адрадзіць гаспадара і стварыць сістэму, якая б дапамагла яму моцна стаяць на нагах, — няма.

Вось на такія думкі навёў артыкул у «Звяздзе». Прабачце за памылкі — ужо забываюцца першыя спатканні, не тое што правапіс (дарэчы, ліст напісаны на добрай беларускай мове і практычна без памылак — **рэд.**). З павагай да ўсяго калектыву «Звязды» і асабіста Яўгена Пясецкага —

Мікалай ТАРАСЕВІЧ,
былы трактарыст калгаса «Шацк» Пухавіцкага раёна.

Хто паедзе на хутар?

Цікавы артыкул у «Звяздзе» «На хутар?», але, мне здаецца, надта ён спазніўся...

Але спачатку пагаворым пра хутар. Што гэта такое, я ведаю, хоць і не жыў на ім. У нас, у Заходняй Беларусі, пры панскай Польшчы хутарная праца праводзілася. Панам хацелася рассяліць вёскі, каб людзі жылі далёка адно ад аднаго, каб менш сустракаліся. У нашай Будчы таксама працавалі інжынеры-землямеры, рыхтавалі вёску да хутароў. Я ведаў прыблізна месца нашага хутара: ён знаходзіўся на адлегласці каля чатырох кіламетраў ад школы. Некаторыя былі і далей, за 5-6 кіламетраў. Па бездарожжы ўвосень і вясной было б немагчыма дзятве наведваць школу, а зімою, у завею — і тым больш. Ды і наогул хутаране адарваныя ад грамадства, ад гандлёвых пунктаў. Дзе купіць патрэбныя рэчы? Дзе правесці свой вольны час і моладзі, і дарослым? Такія пытанні задавалі сабе людзі.

Не дайшло тады да рассялення. Пачалася другая сусветная, Польшча ўступіла ў вайну з Германіяй, мы засталіся жыць у сваёй вёсцы, а інжынеры-землямеры раз'ехаліся хто куды.

А хто сёння можа стаць хутаранінам? Думаю, варта было б спытаць пра гэта маладых гараджанаў, прычым у гарадах розных узроўняў — ці гатовыя яны кінуць горад і заняцца сельскай гаспадаркай на хутары? Бо на нас, старэйшае пакаленне, разлічваць у гэтай справе, вядома ж, не варта — у вёсках засталіся пенсіянеры, якія сваё адпрацавалі і якім не патрэбныя ўжо ні зямля, ні заробкі — тое, чаго не хапала ледзь не ўсё жыццё. Лічу, што моладзь затрымаюць ў вёсках высокі ўзровень культурнага ўладкавання, прадуманая сістэма заробкаў. А там, магчыма, і да хутароў дойдзе справа. Але любую справу рухае матэрыяльны інтарэс, сістэма духоўных, сямейных каштоўнасцяў. Дзяржаве ёсць над чым папрацаваць.

Фёдар КАРПЕНЯ.
в. Будча Ганцавіцкага раёна.

Хутарская перспектыва

Станоўча ўспрыняў намер Мінсельгасхарчу пра стварэнне ў рэспубліцы хутароў (*«Звязда»* ад 24 снежня 2008 г.). Захацелася выказацца, бо і раней меркаваў, што хутарская сістэма — перспектыўная справа.

Мне ўяўляецца, што на адным хутары можа жыць і займацца сельскагаспадарчай вытворчасцю не адна сям'я, а дзве, тры і нават чатыры — але не больш. Скажам, пад 4-сямейны хутар выдзяляецца прыкладна 400 гектараў ворнай зямлі, за кожнай сям'ёй замацоўваецца па 100 гектараў. Такое засяленне хутара (чатырма сем'ямі) мае перавагі. Да хутарскіх сядзібаў трэба пракласці ўсяго адну ЛЭП, а не чатыры, адну дыхтоўную дарогу для заезду. Хутаране-чатырохсямейнікі могуць набываць агульную сезонную тэхніку, скажам бульбаўборачны камбайн, мець адну ферму (будынак) для ўтрымання кароў, пасвіць іх па радоўцы. Будзе пэўная выгада — эканомія часу, у першую чаргу.

Многасямейныя хутаране могуць укараніць больш перспектыўны агульны севазварот, дамовіцца, каму якія сельгаскультуры вырошчваць, каб выгадна потым прадаваць у тым ліку і дзяржаве атрыманую прадукцыю. У іх будзе пэўная планавасць. А дзяржава ў сваю чаргу зможа даводзіць ім заданні. Такі ж напрамак дзейнасці атрымае і жывёлагадоўля.

Будзе выгада і ў абслугоўванні іх. Танней абыдзецца дастаўка з гандлёвай сеткі прадуктаў харчавання, іншых тавараў, падвоз дзяцей у школу, медыцынскае і бытавое абслугоўванне. Можна будзе наладжваць рэгулярную інфармацыйную работу, даваць канцэрты мастацкай самадзейнасці. У сваю чаргу, хутаране змогуць пры жаданні займацца мастацкай самадзейнасцю, сумесна адзначаць святы, сямейныя ўрачыстасці і іншыя мерапрыемствы. Адным словам, жыць калектыўна, больш бяспечна. Іншыя перавагі шматсямейнага хутара падкажа само жыццё.

Леанід АНЦІПЕНКА. *г. Шклоў.*

Хутаранам не страшны любы крызіс

Прачытаў у «Звяздзе» артыкул з Надзеі Каткавец «На хутары?», выразіў выказаць свае меркаванні.

Маё маленства прайшло на хутары Дубішча Мядзельскага раёна. Працаваць на хутары тым, у каго ёсць адпаведныя агранамічныя і заатэхнічныя веды, а таксама жаданне, вельмі выгадна, бо зямля тут жа, за парогам. Выйшаў з хаты — і ты ўжо на месцы працы. Тут твой інвентар, тут назапашаны за зіму гной, тут твая зямля. Гаспадар яшчэ звечара плануе сваю працу і дае заданне ўсім членам гаспадаркі: выканаць тую работу, якая неабходная на гэты момант. Кожны працаўнік, у сваю чаргу, плануе, як падступіцца да задання, як лепш яго выканаць, калі пачаць, калі закончыць. Усё пад рукой: тэхніку на халастыя абароты пераганяць не трэба, усё робіцца эканомна, разумна, хутка. Пайшоў дождж — заходзіш у хату, адпачываеш; паказалася сонца — працягвай працу. У той час людзі, якія жылі на хутарах, карысталіся павагай у грамадстве, бо, як правіла, былі адметныя працаўнікі, гаспадары.

Я нарадзіўся на хутары ў 1924 годзе. Цяпер перажываю ў сваім жыцці другі сусветны крызіс. Першы быў у 1929 годзе. Тады мне было 5 гадоў і, зразумела, пра крызіс я нічога не ведаў, толькі потым чуў аповеды старэйшых. Цяпер зразумеў, што жыхарам хутароў крызіс нічым не пагражае, а дапамагчы можа. Якраз падчас крызісу да бацькі на хутар з гарадоў прыязджалі прадстаўнікі заводаў і прапаноўвалі купіць сельскагаспадарчыя машыны: малатарню, сячкарню, драпак і інш. Па выгаднай цане. У той час бацька і купіў гэтыя машыны. Я гэта добра запомніў, бо ўважліва разглядаў кожную, залазіў на іх, круціў усё, што круцілася. Прыязджалі і купцы на хутар, куплялі ўсё, што было ў гаспадарцы на продаж: быкоў, свіней, авечак, цялят, курэй, гусей, індыкоў, трусоў, зерне, бульбу, агародніну, садавіну. Усё гэта мела добры кошт, а машыны, наадварот, былі не вельмі дарагія.

Цяпер умовы працы зміняліся ў параўнанні з ранейшымі, працаваць на зямлі стала ў сотні разоў лягчэй, бо чалавеку дапамагае бязліч усялякіх разумных машын. Так што хутарская сістэма як адна з відаў уладкавання, мае ў нашай краіне права на жыццё. Добрыя дарогі дапамогуць хутка перавозіць усё вырашчанае, а прадукцыя будзе якаснай і больш танней, бо прадаваць яе стане той, хто вырабляе.

Некаторыя маладыя людзі кажуць, што на хутарах сумна жыць. Упэўнены: у наш час такіх праблем проста не будзе. Я назіраю за маладымі людзьмі. На дыскатэку, якая знаходзіцца ў Вішнеўскім клубе, збіраецца моладзь з усяго навакольля і нават з бліжэйшых гарадоў — па 300 чалавек набіраецца. Едуць на машынах, на матацыклах. Не так, як у мой час, калі хадзілі пехатою ды яшчэ і разуваліся, каб зберагчы абутак. Вядома, моладзь з'ехала ў гарады. Аднак у час крызісу там не будзе хапаць працы для ўсіх. У вёсцы ёй шукаць не трэба: бяры зямлю, заводзь гаспадарку, працуй, не лянуйся — і сам будзеш сыты, і іншым прадасі тое, што вырасціў.

Іван БЯЛЯЎСКІ, *в. Вішнева Смаргонскага раёна.*

Прамая лінія

ДАЛОЎ КАМЯНІ... І ЦЫСТЫТ, І ПРАСТАТЫТ

(Працяг. Пачатак у нумары за 24 снежня.)

Калі трэба звяртацца да ўролага — расказвае ўсім, хто дазваніўся на нашу медыцынскую «прамую лінію», кіраўнік цэнтра ўралогіі г. Мінска, загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр СТРОЦКІ.

☎ — Мінск, Таццяна Міхайлаўна. Бацьку — 68 гадоў. Яму рабілі аперацыю па выдаленні адэномы прастаты. Але аперацыя была зроблена няўдала, зрабілі паўторную. У выпісцы было напісана: рэканструкцыя шыйкі мачавога пузыра. На працягу месяца бацька знаходзіўся ў бальніцы, цяпер ужо колькі дзён як дома. Скардзіцца на нетрыманне мачы, шум у галаве, галавакружэнне, бяссонніцу. Прымае абактал. Што вы парэкамендуеце? Якія могуць быць прагнозы адносна яго стану?

— Мне цяжка абмяркоўваць лячэнне, паколькі я не ведаю вынікаў абследавання вашага бацькі... Яму рабілі адкрытую аперацыю ці праз мочаспускальны канал?

— Пасля аперацыі ўставілі тры трубкі...

— Значыць, не праз канал. Пасля любой аперацыі бываюць пэўныя ўскладненні. Яны не частыя, але здараюцца. Ложа прастаты пасля выдалення дабраякасна гіперплазіі павінна зарубцавацца. Калі ў пацыента ўсё добра зажывае, утвараецца добры рубец, як гэта і адбылося ў вашага бацькі, то ў некаторых хворых можа поўнасцю зарасці рубцовай тканкай шыйка мачавога пузыра. Тады можа ўзнікнуць патрэба ў паўторнай аперацыі. Што датычыцца шуму ў галаве, то гэта, хутчэй за ўсё, праяўляецца атэрасклероз сасудаў галаўнога мозгу. Таму лепш параіцца з неўрапаталогам.

— А прыём абакталу можа паўплываць?

— Абактал можа выклікаць падобныя адчуванні ў сталых людзей. Таму падыдзіце да ўрача і скажыце, што на фоне ўжывання прэпарата ўзніклі вось такія адчувані. Нягай прэпарат заменяць на іншы.

— Нам варта лячыцца дома ці трэба класціся ў бальніцу?

— Вы ж толькі з яе выпісаліся. Зараз ваш бацька прымае выключна таблеткі, а гэта можна рабіць і дома.

— Мы можам чакаць таго, што нетрыманне мачы скончыцца?

— Я не бачу зараз вашага бацьку, і не магу дакладна адказаць на ваша пытанне. Магу толькі сказаць, што падобная сітуацыя назіраецца ў 2 працэнтаў людзей, прааперыраваных па прычыне адэномы.

☎ — Ала Адамаўна з Мінска. Як толькі прастыну ці моцна засмяюся, атрымліваецца нетрыманне мачы. Гэта трэба лячыць?

— Безумоўна. Трэба звярнуцца да ўрача... У вас выдзяляецца мача пры кашлі, пад'ёме цяжкасцяў — правільна я разумею?

— Так.

— Вазьміце ў свайго ўролага накірунак у 4-ю мінскую бальніцу, і мы вырашым ваша пытанне. Гэты стан лечыцца, і трэба абавязкова рабіць гэта. Калі ў вас — 1-2 стадыя захворвання, то будзем лячыць кансерватыўна, калі не — значыць, хірургічна.

☎ — Салігорскі раён, Антаніна Сяргееўна. У дачкі камень у правай нырцы. Адчувае пастаянны боль у жываце і частыя колікі. У лютым у абласной бальніцы падрабнілі камень, сказалі, што разбурыўся. Месяцы тры было ўсё нармальна. Без болю. А потым яны зноў з'явіліся, і на ўльтрагуку высветлілася, што ёсць камень — 8 мм. Ці мог ён утварыцца за такі кароткі час?

— Хутчэй за ўсё, гэта фрагмент ад таго, што быў. Ён пачаў рухацца, і даваць непрыемныя сімптомы. Трэба зноў пад'ехаць у абласную бальніцу і дадрабніць камень.

— А як часта можна рабіць такую працэдуру?

— Тры-чатыры разы ў год — можна.

— А які ўплыў аказвае драбненне на нырку і арганізм у цэлым?

— Уплыў драбнення камянёў на арганізм шмат вывучаўся, але галоўная выснова, да якой удалося прыйсці, — што ніякага значнага ўплыву няма. Не даказаны дрэнны ўплыў і на нырку.

Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

БАНДА ЗАТРЫМАНА

Грамадзяне Украіны вярталіся ў Закарпацкую вобласць з Масквы на мікрааўтобусе «Мерседэс 312».

31 снежня ў 3 гадзіны ночы каля в. Рэчыца, на аўтамагістралі Мінск-Брэст, іх нагналі тры аўтамашыны і блакіравалі мікрааўтобус. Пагражаючы прадметам, які меў падабенства з пісталетам, невядомыя забралі ў грамадзян Украіны 100 тыс. расійскіх рублёў, сотавыя тэлефоны, іншую маёмасць і з'ехалі. Пацярпелыя праз гадзіну заявілі пра напад у Белаазёрскае аддзяленне міліцыі. Да затрымання злачынцаў падключыліся спецпадраздзяленне «Алмаз», супрацоўнікі крымінальнай міліцыі МУС, Бярозаўскага РАУС, і рабаўнікоў затрымалі ўжо ў сталіцы і Мінскім раёне. Усе яны былі ў свой час асуджаныя.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗБІЛІ ПЕШАХОДАЎ НА ВЯСКОВАЙ ВУЛІЦЫ

2 студзеня каля апоўдня ў вёсцы Сялецкае Касцюковіцкага раёна 24-гадовы мясцовы жыхар ехаў па вуліцы на аўтамабілі «Фольксваген-пасат». Не справіўшыся з кіраваннем, ён наехаў на групу людзей, якія стаялі на краі праезнай часткі. У выніку на месцы загінуў 23-гадовы вясковец, яшчэ тры чалавекі трапілі з рознымі траўмамі ў лякарню.

Алена КАЗЛОВА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды двух земельных участков общей площадью 2,1976 га сроком на 99 лет для строительства объекта придорожного сервиса на км 36 (лево, право) автомобильной дороги М-3 Минск-Витебск в районе д. Силичи Логойского района, кадастровые номера земельных участков 623282000011000001, 623282000011000002. Начальная цена предмета аукциона – 163 806 170 бел. рублей. Земельный участок на км 36 (право) имеет ограничения в использовании земель на площади 0,4310 га (охранные зоны линии электропередачи напр. свыше 1000 вольт и линии связи и радиофикации).

Участник аукциона, ставший Победителем, обязан:

1. в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельных участков внести плату за право заключения договора аренды земельных участков, возместить убытки в сумме 2 716 646 рублей, причиненные изъятием земельных участков, потери сельскохозяйственного производства в сумме 96 116 400 рублей, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона;

2. заключить с Логойским райисполкомом договор аренды земельных участков и осуществить государственную регистрацию возникновения права на эти участки;

3. получить в установленном порядке разрешение Логойского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

4. в течение шести месяцев со дня получения свидетельств (удостоверений) о государственной регистрации возникновения права на предоставленные земельные участки приступить к занятию данных участков;

5. снять на занимаемых земельных участках плодородный слой почвы и использовать его согласно проекту рекультивации;

6. осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией и согласованные с Минским облисполкомом.

Договор аренды земельных участков заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после совершения Победителем аукциона действий, указанных в пункте 1 настоящего извещения. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Задаток в сумме 16 000 000 рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г.Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Аукцион состоится **10 февраля 2009 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04 февраля 2009 года** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, в том числе: **ЛОТ № 2** – арочное сооружение с лесопильной рамой (501,8 кв.м) по адресу: Узденский р-н, пос. Смолзавод. Нач. цена 71 713 770 бел. руб.; **ЛОТ № 3** – цех сборного железобетона с подстанцией и пропарочной камерой (921,7 кв.м) по адресу: г. Узда, ул. К. Маркса. Нач. цена 25 199 910 бел. руб.; **ЛОТ № 4** – склад заполнителей (202,8 кв.м) по адресу: г. Узда, ул. К. Маркса. Нач. цена 13 531 860 бел. руб. Начальные цены лотов снижены на 20 %. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.04.2008 г. Аукцион состоится **27.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.01.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Крупицкого сельисполкома

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов: **Лот № 1** – д. Вербники, пл. 0,1526 га, начальная цена – 13 691 272 рубля; **Лот № 2** – д. Крупица, пл. 0,1746 га, начальная цена – 10 000 000 рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2008 г. Аукцион состоится **03.02.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.02.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

ВЫПРАБАВАННЕ ЛІЧЫЛЬНІКАМІ

Як сустрэнеш Новы год, так і правядзеш... Ой, не хацелася б! У самым пачатку снежня нам патэлефанавалі з жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка. «У гэтым годзе вы павінны паставіць лічыльнікі на ваду, інакш у наступным будзеце плаціць значна больш, чым зараз», — жаночы голас не прадугледжваў адказаў з майго боку. Трэба сказаць, я і не думала супраціўляцца. Адцягвала гэтую шчаслівую падзею па вельмі простай прычыне — думала, атрымаецца зрабіць рамонт, замяніць усе магчымыя камунікацыі і адначасова паставіць лічыльнікі — каб некалькі разоў не разварочваць усё ў санвузле. Ну, не атрымалася...

Цяпер на Гомельшчыне будуць станоўчыя справаздачы па колькасці ўсталяваных лічыльнікаў на ваду.

Добра, лічыльнікі дык лічыльнікі. «Вы ў графіку на 27 снежня». Таксама, думаю, нядрэнна — не на 31-е ж... Праз тыдзень прыйшоў сантэхнік, паглядзеў камунікацыі і загадаў: «Вы павінны прабіць дзірку з прыбіральні ў ванны пакой вось такога памеру — намаляваў на плітцы. Купіце 2 метры металапластыку і 4 фітынгі: 3 з унутранай, 1 з вонкавай разьбой, дыяметрам на 0,5 дзюйма». Я ўсё запісала і падумала: добра, ёсць муж, будзе дзяўбаць з задавальненнем, а што рабіць тым, у каго няма?».

Да 27 снежня ўсё было куплена і дзірка зроблена ў адпаведнасці з пазначанымі маркерам лініямі. Своечасова раніцай прыйшлі сантэхнік са зваршчыкам і паставілі ўсё вельмі зручна, каб можна было паказанні здымаць, не кладучыся на падлогу (у маёй мамы лічыльнікі так стаяць дагэтуль). Праўда, напрыканцы сантэхнік паківаў галавой і сказаў: «Трубы ў вас дрэнныя зусім...» Муж прапанаваў: дык давайце адразу і заменім. Не, адказвае, не раней за май — зараз усе спецыялісты толькі лічыльнікамі занятыя. З пажаданнямі добрага Новага года і развіталіся.

Напрыканцы працоўнага дня, як было загадана, я зайшла ў свой ЖЭУ, каб атрымаць дагаворы на ўсталяванне лічыльнікаў і выкананне рамонтна-будаўнічых работ. Пакой майстроў можна было вызначыць па шматгалоснай гутарцы на значна павышаных танах. Баязліва ўвайшла і зразумела, што ў ім толькі два супрацоўнікі. Усе іх тэлефоны, у тым ліку мабільныя, званілі разам. Мужчына і жанчына гучна прымалі заяўкі і дзясяты раз па чарзе растлумачвалі камусьці, што яны зробяць з тым, хто ходзіць па даху дома № 2. Потым у кагосьці адключылася ацяпленне па стаяку, і трэба было прымаць тэрміновыя меры. З незадаволенымі тварамі яны ва ўсе бакі аддавалі загады падначаленым электрыкам і сантэхнікам... Калі, нарэшце, чарга дайшла да мяне, я, здаецца, усё ведала аб калектыўных і асабістых скаргах жыхароў свайго раёна.

— Мне б дагавор на зробленыя работы...

— Чакайце, надрукуем.

Чакаю. І зноў даведваюся, з якімі шматлікімі праблемамі жыхары звяртаюцца да «хуткай камунальнай дапамогі» — супрацоўнікаў жыллёва-камунальнай службы. І не зайздрошчу ім... Спачуваю.

— А яшчэ, у мяне кроплі вады вакол усталяванага лічыльніка, — кажу, — можа, кандэнсат, а можа, падцякае.

У адказ на гэта майстар бярэ свой тэлефон і падарваным голасам на мове, якую разумеюць, відаць, толькі сантэхнікі, загадвае таму спецыялісту, які ставіў лічыльнікі: «Ідзі і зрабі, каб не цякло! Што?.. У цябе яшчэ сорак хвілін працоўнага часу!». Вы ж разумееце, што некаторыя словы ў іх размове я прапускаю — усё адно не надрукуюць. Пакуль я чакала патрэбную паперу, сантэхнік у мяне дома ліквідаваў цечу.

Прынамсі, я да гэтага часу не зразумела, чаму большую частку матэрыялаў, якія былі патрэбны для ўсталявання лічыльнікаў, сантэхнікі прынеслі з сабой і ўключылі ў каштарыс, а вось два метры металапластыку і чатыры фітынгі я павінна была купляць. Можа, для таго, каб у дагаворы з'явіўся запіс: «Падрадчык за якасць матэрыялу заказчыка адказнасці не нясе». Дык я не была супраць, каб і гэта быў «матэрыял падрадчыка»!

А навагодні падарунак нас чакаў яшчэ праз гадзіну. Адна з тых самых трубаў, якая, па словах спецыяліста, «дрэнная зусім», не вытрымала выпрабавання пастаноўкай лічыльнікаў. І спачатку засіфоніла, а потым прарвала сантыметровай адтулінай. Ваду мы перакрылі своечасова — ніхто з суседзяў не пацярпеў. Быў вечар суботы. Напярэдзе былі два выхадныя ў камунальнікаў...

Я адразу ўзгадала спасылку на май, калі нарэшце вызваляцца сантэхнікі, і зразумела, што мне зусім не хочацца жыць чатыры бліжэйшыя месяцы без гарачай вады. Потым ўзгадала няшчасныя твары майстроў у ЖЭУ і ўявіла, як яны будуць рады атрымаць раніцай 30 снежня яшчэ і маю заяўку. І калі будуць яе выконваць... І як мы разам радасна сустрэнем новы, 2009 год... І пачала абзвоньваць знаёмых у пошуках сантэхніка, які згадзіўся б мяне ашчаслівіць гарачай вадой хаця б крыху раней.

Цікава, што за гэты час я пачула шмат гісторый пра ўсталяванне лічыльнікаў на ваду. Сябры мяне супакойвалі практычна аднолькава: «Гэта табе пашанцавала, што ўсё здарылася адразу ж, — казалі, — вось у мяне прарвала праз два (тры, чатыры) месяцы пасля ўсталявання і калі нікога не было дома». Мужчыны лічылі неабходным мне, цёмнай у справах «вентыляў і сальнікаў», растлумачыць, што трубы, якія ўсталёўваліся ў нашых панэльках канца 60-х — пачатку 70-х, даўно згнілі і любое механічнае ўздзеянне на іх прыводзіць усё да таго ж банальнага выніку. Між тым, майму дому, як і многім іншым, капітальны рамонт не пагражае — у рэальнай перспектыве ён не прадугледжаны.

Сантэхнік быў знойдзены сярод маіх няблізкіх сваякоў. Прыйшоў усё ж такі 30-га (раней быў заняты), не толькі са сваім інструментам, але і з трубамі, якія трэба было мяняць кардынальна. Тут я зусім праніклася тэрміналогіяй і даведалася пра тое, што «Можна было б часова абцісnуць хамутом, але ж дзірка вельмі вялікая, не вытрымае...». Коля некалькі гадоў адпрацаваў у ЖЭУ і таксама пацвердзіў версію, якую мне агучвалі знаёмыя наконт таго, што дзе тонка, там і рвецца. Прарывае, значыць.

Пакуль яны з мужам падымалі ванну і мянялі часткі трубаў, я слухала вясёлыя гісторыі з жыцця сантэхнікаў. «Афоня» адпачывае. Праўда, разнастайнасці было няшмат, затое мастацкай афарбоўкі — дастаткова. Любілі яны, сантэхнікі, аказваецца, выконваць «гуманітарныя заяўкі». Гэта калі нешта здараецца ў доме VIP-персоны (вялікага начальніка, дэпутата, юрыста...) У такім разе трэба адразу кідаць звычайную, не VIP-персону, і хутчэй бегчы выконваць загад. «А з якой-небудзь бабкі, у якой пенсія 300 тысяч, могуць садраць за паламаны кран у тры разы больш, чым трэба». Наш Коля не вытрымаў у адзін момант складанага жыцця «сантэхніка па выкліку» і пайшоў зарабляць грошы на будоўлю. І, трэба сказаць, не шкадуе. Такім чынам, з пераказам біяграфіі, жартамі і нават абсалютна цвяроза мае камунікацыі да вечара аўторка былі адраманаваныя.

Як мала трэба для шчасця — толькі, каб перад Новым годам была гарачая вада, — думала я сярод будаўнічага смецця раніцай у сераду, 31 снежня, і хуценька прыбіралася. Бліжэй да вечара выйшла ў краму — трэба ж было нарэшце купіць што-небудзь да святочнага стала. Калі вярталася — не паверыце — ва ўсім доме было адключана святло. Муж ужо спакойна дастаў з паліцы газавую лямпу, над наяўнасцю якой у кватэры я звычайна пакеплівала, працёр шкло, запаліў агеньчык... Але ж прыехала аварыйка, і за некалькі гадзін да Новага года свята з'явілася.

Свята прыйшло ў вызначаны тэрмін, я загадала жаданне: перажыць непазбежны ўжо рамонт санвузла з найменшымі матэрыяльнымі і маральнымі стратамі. Дарэмна. На другі дзень новага года я зразумела — усе выпрабаванні мінулага былі псіхалагічнай падрыхтоўкай да сёлетняй дэвальвацыі рубля.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«ХАНДРАЗАМІН» ПА ЛЬГОЦЕ НЕ ВЫПІСВАЮЦЬ?

У рэдакцыю патэлефанавала жыхарка вёскі Жылехава Капыльскага раёна Вера Іосіфаўна Баран. Вера Іосіфаўна мае інваліднасць другой групы і, адпаведна, карыстаецца льготамі пры лекавым забеспячэнні. Але нядаўна яна сутыкнулася з нечаканай праблемай: доктар адмовіўся выпісваць ёй па льготным рэцэпце прэпарат «Хандразамін», які выпускаецца прадпрыемствам «Мінскінтэркапс». Сказаў, што гэтага прэпарата няма ў пераліку лекавых сродкаў, якія адпускаюцца на льготных умовах. Прапанаваў яго аналаг «Хандраіціна сульфат», таксама беларускі прэпарат, які ў пераліку ёсць. «Я прымала і першы, і другі прэпарат, але мне ў большай ступені дапамагае «Хандразамін», які мне выпісвалі раней. Да таго ж «Хандраіціна сульфат» не заўсёды бывае ў нашай аптэцы, а «Хандразамін» там ёсць практычна заўсёды, — паскардзіліся наша чытачка.

На жаль, нягледзячы на ўсю знешнюю абсурднасць сітуацыі, паколькі і ў першым, і ў другім прэпараце асноўным дзейным рэчывам з'яўляецца хандраіціна сульфат, і абодва гэтыя прэпараты маюць беларускае паходжанне, доктар і сапраўды не мае права выпісаць сваёй пацыентцы «Хандразамін».

— Розніца ў тым, што «Хандразамін» з'яўляецца камбінаваным прэпаратам, і акрамя хандраіціна ў яго склад уваходзіць таксама яшчэ і глюказамін, — патлумачыла журналісту «Звязды» **начальнік аддзела арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Наталля МАЛАШКА.** — На аснове хандраіціна ўвогуле існуе шмат камбінаваных прэпаратаў розных вытворцаў, не толькі беларускіх, але і замежных. «Хандразамін» — гэта толькі адзін прэпарат з многіх аналагічных, у тым ліку і вельмі нятанных. Але нагадаю, што бясплатнае і льготнае лекавае забеспячэнне пацыентаў ажыццяўляецца ў межах Пераліку асноўных лекавых сродкаў, таму доктар, які кіруецца афіцыйным дакументам, можа выпісаць па льготным рэцэпце толькі «Хандраіціна сульфат». А «Хандразамін» у згаданы вышэй пералік не ўваходзіць...

Надзея НІКАЛАЕВА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, расположенных на территории Михановичского сельсовета Минского района: **Лот 1** – земельный участок площадью 0,2320 га в д. Кайково, начальная цена – 43 808 653 рубля; **Лот 2** – земельный участок площадью 0,2292 га в д. Кайково, начальная цена – 43 280 928 рублей; **Лот 3** – земельный участок площадью 0,1498 га в д. Чуриловичи, начальная цена – 21 211 680 рублей. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.11.2008 г. Аукцион состоится **27.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.01.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Утерянные представительством № 1 по г. Минску Белгосстраха **бланки страховых свидетельств** обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь, **серии АЖ с № 4141225 по № 4141227 считать недействительными.**

Суд **Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці** просіць грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра **Ільюшэнку Таццяну Іосіфаўну,** 1962 года нараджэння, ураджэнку г. Гродна, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Гродна, Індурскае шасэ, д. 10, кв. 328, паведаміць іх суду на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

***КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (УНП 690324015) по поручению Мачулищанского посисполк

«ЗАТРЫМАНЫ» СМЯРОТНА НЕБЯСПЕЧНЫ ПАРАШОК

Упраўленне Камітэта дзяржаўнай бяспекі па г. Мінску і Мінскай вобласці канфіскавала ў аднаго са сталічных жыхароў самую буйную за мінулы год партыю псіхатропнага рэчыва — 2,3 кг метамфетаміну. Мінімальны кошт такой колькасці складае на чорным рынку каля 300 тысяч долараў.

Гэта рэчыва ўваходзіць у спіс асабліва небяспечных, з'яўляецца моцным узбуджальным сродкам для цэнтральнай нервовай сістэмы. Яго ўжыванне павышае ціск, тэмпературу цела, тэмп дыхання, выклікае псіхоз, слыхавыя і зрокавыя галюцынацыі. Нават пры першым ужыванні можа выклікаць псіхічную залежнасць, раз'юшанасць, справакаваць на гвалтоўныя дзеянні, пры паўторным ужыванні развіваюцца псіхічныя расстройствы — неўроз, параноя, дэпрэсія і псіхоз. Нават непрацяглае ўжыванне метамфетаміну ў асобных выпадках можа прывесці да лятальнага канца. Як стала вядома, затрыманая буйная партыя псіхатропнага рэчыва паступіла ў краіну з-за мяжы і была прызначана для рэалізацыі ў моладзевым асяродку, галоўным чынам, у клубах і на дыскатэках.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ФЕЕРВЕРКІ» Ў НАВАГОДНЮЮ НОЧ

У жыхара в. Падлессе-Камянецкае згарэлі два стагі — сена і салома — якія стаялі пры доме ў двары.

Брэсцкія аператыўнікі высветлілі, што падпал зрабіў 18-гадовы хлопец з гэтай жа вёскі.

І ў гэтую ж навагоднюю ноч у в. Фядоры Столінскага раёна невядомы падпаліў хлеў пенсіянеркі. Міліцыянеры злачынца затрымалі. Падпальшчыкам аказаўся беспрацоўны аднавяскавец.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗВЫЧКА МІНІРАВАЦЬ

З студзеня каля 16 гадзін паступіла інфармацыя аб замініраванні чыгуначнага вакзала на станцыі «Бабруйск». Усе службы аператыўна выехалі на месца здарэння, аднак агляд вакзала і навакольнай тэрыторыі не выявіў ніякага выбуховаго прыстасавання.

Пошукавыя работы не сарвалі графік руху цягнікоў, а міліцыя хутка выявіла віноўніка пярэпалаху. Ім аказаўся 27-гадовы мінчанін, які нідзе не працуе. Аднак гэты чалавек ужо апынуўся ў цэнтры аналагічнага здарэння ў Мінску, калі летась паведаміў аб несапраўдным замініраванні гімназіі. У Бабруйску праінфармавалі, што ён затрыманы, праводзіцца праверка.

Алена КАЗЛОВА.

Жыццё як цуд

МАЦНЕЙ ЗА НЕМАГЧЫМАЕ

У пералік самых важных дасягненняў 2008 года можна смела паставіць нараджэнне гэтага дзіцяці

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Гэты новы год яны сустрэлі разам: мама, тата, бабуля і маленькі Ягорка. Сустрэчу новага 2008-га яны не святкавалі. Але ўжо праз чатыры месяцы даведаліся, што год стане для іх шчаслівым.

— Гэта дзед там, на нябёсах, вымаліў унука, — не сумняваецца Аксана. — Ён хацеў, напэўна, не меней за нас.

Можа і так. Містычным можа падацца і тое, што Аксану выпісалі з радзільні ў той самы дзень, у які памёр свёкар. Роўна праз год. Натуральна, што і назваць немаўлятка яны рашылі ў гонар дзеда. А можа, усё гэта — супадзенне. Проста жыццё працягваецца. Нехта сыходзіць у вечнасць, а нехта прыходзіць у наша часовае жыццё — каб суцешыць, падарыць радасць і абяцанне ў тое, што нічога не канчаецца. Але з'яўленне Ягоркі на свет — сапраўды цуд. І, магчыма, лепей за яго бацькоў гэта ведаюць медыкі, якія вялі цяжарнасць 26-гадовай магіляўчанкі Аксаны.

— Яшчэ сем гадоў таму гэта было б немагчыма, — кажа выканаўца абавязкаў намесніка галоўнага ўрача Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Павел КАРАВАЙ. — Можна сказаць, што пры такіх абставінах дзіця нарадзілася ў Беларусі ўпершыню. І што самае галоўнае, і дзіця, і маці зараз адчуваюць сябе добра.

ПТУШАЧКА

Так яе называюць супрацоўнікі медперсаналу Цэнтра. Яна і падобная на птушачку: мініяцюрная, жывая, хуткавокая і ўсмешлівая. І размаўляе, нібы шчабеча:

— Мне так хочацца дадому, што, здаецца, я на таксі паехала б...

— Птушачка, — супакойвае яе доктар, — табе належыць медыцынскі транспарт. Але на тваім месцы я і пешшу б пайшоў...

— Вой, я ўжо думала пра гэта!

За 10 тыдняў знаходжання ў Цэнтры яе тут усе палюбілі. Яна з асалодай шчабеча з вахцёрам, мае сотавыя тэлефоны палатных медсясцёр, а лекар фатаграфуе яе сыночка ў першыя хвіліны яго з'яўлення на свет. Каб потым ёй паказаць. З асаблівай цеплынёй Аксана ўзгадвае дактароў і медсясцёр аддзялення рэанімацыі. Яна кажа: «Калі б не ўсе гэтыя людзі, я не выжыла б». Яна, магчыма, і не падазрае, наколькі блізкая да праўды.

Аксана — сярэдняя дачка сваіх бацькоў. Яна атрымала спецыяльнасці лабаранта хімічнага аналізу і цырульніка, але шэсць гадоў працавала... ахоўнікам. Немагчыма ўявіць гэтае кволае дзяўчо з аўтаматам у руках.

— А ў нас аўтаматаў і не было, — смяецца яна. — Мы ахоўвалі электрасеткі, хадзілі і глядзелі, каб ніхто не здымаў правады. Потым я ўладкавалася ахоўнікам на прыватнае прадпрыемства. Там усё назіранне вялі камп'ютары і відэакамеры, а нам трэба было толькі кнопку трывогі націскаць, калі што не так.

2003 год для Аксаны аказаўся цяжкім. Спачатку яна перажыла быццам бы адну з самых простых аперацый — апендыцыт. Але праз тыдзень дзяўчыне давялося зноў класціся на аперацыйны стол, бо ўзнікла ўскладненне — перытаніт.

— Магчыма, у выніку мой імунітэт аслабеў, — мяркуе Аксана.

А праз паўтара месяца раптоўна памерла яе маці, ад інсульту, ва ўзросце 45 гадоў. Вось тады і праявілася ўпершыню цяжкая хвароба Аксаны — сістэмная чырвоная ваўчанка. Як тлумачаць медыкі, гэта хранічнае генералізаванае (распаўсюджанае па ўсім арганізме) захворванне злучальнай тканкі і сасудаў. Мяркуецца, што прычынай яе можа быць вірусная інфекцыя, якая дзейнічае на фоне зменанага імунітэту, у выніку чаго развіваюцца антыцелы да ўласных органаў і тканак. Аднак медыцыне дагэтуль дакладна не вядома, што выклікае гэтую хваробу, а таму і сродак супраць яе пакуль не знойдзены. Вядома толькі, што церпець ад яе звычайна маладыя жанчыны і дзяўчаткі і што яна мае сямейна-генетычнае паходжанне.

Хвароба пачалася з таго, што ў Аксаны апухлі суставы, яна не магла рухацца. Яе спачатку завезлі ў Магілёўскую бальніцу, потым у Мінск, дзе і паставілі канчатковы дыягназ. Паступова яе стан палепшыўся, суставы прыйшлі ў норму. Але ў 22 гады Аксане сказалі, што ёй нельга мець дзяцей. І гэты прысуд стаў самым цяжкім выпрабаваннем, які выпаў на яе долю.

ДЗІЦЯ

Аксана з Уладзімірам пазнаёміліся, калі ім было па 16 гадоў. Праз чатыры гады яны сталі жыць разам. Яны пакуль афіцыйна не аформілі свае адносіны, хоць лічаць сябе мужам і жонкай. Аксана кажа, што ёй пашанцавала з Уладзімірам.

— Мы ніколі яшчэ не сварыліся, — усміхаецца яна, і ў яе словах адчуваецца такі жаночы гонар і ўпэўненасць у іншым чалавеку, што адразу верыш і ёй, і яе мужчыну.

І вельмі хочацца думаць, што гэтая пара не падобная на тыя, якія не жэняцца, бо не ўпэўненыя адно ў адным, бо нехта баіцца звязваць сябе абавязацельствамі і г.д.

Яны адрозніваюцца ад многіх сваіх аднагодкаў, пра гэта сведчыць не толькі тое, што нягледзячы на хваробу Аксаны і забарону дактароў мець дзяцей, яны засталіся разам. Цяпер лічыцца, што маладая сям'я павінна паспець удосталь «пажыць для сябе», перш чым рашацца на працяг роду. Праўда, пры гэтым часта не ўлічваецца адна рэч. Дзіця — гэта не тое, што пайшоў і набыў, калі спатрэбілася. Гэта цуд, з'яўленне якога не падпарадкоўваецца ніякай логіцы. І пралічыць тут часта бывае немагчыма.

Дык вось Аксана, як толькі яе хвароба праз чатыры гады ўступіла ў стадыю рэмісіі, вырашыла скарыстаць гэты шанц. Яна разумела, што ён будзе, хутчэй за ўсё, адзіны, што яе арганізм яшчэ амаль не пацярпеў ад хваробы і яго рэзерваў для нараджэння дзіцяці павінна хапіць... У іх з Уладзімірам няма ні асобнага жылля, ні высокааплатнай работы, яны яшчэ пакуль не паспелі паездзіць па свеце, пажыць у пяцізоркавых гатэлях... Больш за тое, урачы сказалі ім, што падчас цяжарнасці хвароба Аксаны можа ўскладніцца, што Аксана можа нават загінуць.

— Не ўсе дактары былі адзінадушныя, — распавядае Уладзімір. — Адзін сказаў нам, што можа быць і наадварот, і мы вырашылі верыць яму.

— Ён стары, ужо на пенсіі, і напэўна, пашкадаваў нас, — узгадвае Аксана. — Да таго ж, аналізы ў мяне ўжо доўгі час былі добрыя, а значыць, з дзіцем павінна быць усё ў парадку.

У іх не адразу атрымалася. Аксане нават паставілі новы дыягназ: бясплоднасць. І вось праз год здарылася. Яна зацяжарала. Цяпер яна маліла Бога пра адно: каб быў хлопчык. Бо лічыцца, што хлопчыкі не атрымліваюць у спадчыну гэту хваробу. А на ліпень яны прызначылі вяселле. Праўда, з-за таго, што Аксана трапіла ў бальніцу, дакументы з ЗАГСа давялося забраць. Часова. Цяпер галоўным сведкам рэгістрацыі іх шлюбу будзе маленькі Ягорка.

У жаночай кансультацыі Аксану папярэдзілі, што ўсю цяжарнасць ёй трэба будзе ляжаць. А яна лятала, нібы ў яе выраслі крылы і ўдвая прыбавілася сілаў, яна адчувала сябе шчаслівай і энергічнай. Яны з Уладзімірам не сумнявалися, што ўсё ў іх будзе добра, інакш проста не можа быць. Сваякі і блізкія падтрымлівалі. Увесь калектыў Уладзіміра чакаў гэтае малое. Хутка высветлілася, што Нябёсы пачулі малітвы Аксаны: у іх павінен нарадзіцца хлопчык.

Аксана добра разумела, што гэта яна зрабіла выбар на карысць дзіцяці, а медыкі ў выпадку небяспекі ў першую чаргу будуць выратоўваць маці. Таму ў сталічную клініку яна свядома паехала тады, калі датэрміновыя роды ўжо былі для малога не страшныя. Па сутнасці Аксана ў літаральным сэнсе гэтага слова ахвяравала сабой дзеля сына.

— Перад намі паўстала дылема, — тлумачыць Павел Каравай. — З аднаго боку, захворванне перашкаджала цяжарнасці, з іншага — лячэнне магло пашкодзіць дзіцяці. Таму гэта захворванне і з'яўляецца проціпаказаннем для цяжарнасці. Аксана не пагадзілася цяжарнасць перарваць, і нам нічога не заставалася, як зрабіць усё магчымае і немагчымае, каб максімальна зберагчы і маці, і дзіця.

Перавага Цэнтра «Маці і дзіця» перад іншымі клінікамі не толькі ў канцэнтрацыі тут найноўшай апаратуры і высакакласных спецыялістаў у галіне жаночага і дзіцячага здароўя, але і ў тым, што тут ёсць магчымасць кансультацыі лепшых спецыялістаў краіны па ўсіх абласцях медыцыны. Так, для пастаянна карэкцыі зменаў, якія адбываліся ў арганізме Аксаны, былі запрошаныя вядучыя гематолагі, кардыёлагі, рэўматолагі, пульманолагі і нефролагі Беларусі. Недасведчанаму чалавеку цяжка зразумець, што зрабілі ўсе гэтыя людзі разам з супрацоўнікамі Цэнтра. Яны зрабілі немагчымае. Яны давялі цяжарнасць Аксаны практычна да прыроднага тэрміну — да 38 тыдняў. Пры гэтым, нягледзячы на вельмі сур'ёзную ступень хваробы, максімальна захавалі два жыцці. Рызыка была вельмі вялікая: у любое імгненне ў маці маглі ўтварыцца тромбы ў сасудах, перастаць функцыянаваць сэрца, лёгкія, ныркі. Лячэнне Аксаны было падобна на хаджэнне па краі ляза. І ў тым, што ўсё, як і верылі Аксана з Уладзімірам, скончылася добра, была немалая заслуга і самой Аксаны.

— Яна супрацоўнічала з дактарамі, выконвала ўсе рэкамендацыі, заставалася мужнай і ўпэўненай у поспеху, — кажуць пра яе тыя, хто ведаў пра яе хваробу больш, чым яна сама. — І што самае галоўнае — яна заўсёды заставалася жыццярадаснай.

Здаецца, што гэта маленькая жанчына, падобная на птушачку, не пакідала шанцу сумнявацца самым вялікім скептыкам.

Аперацыя «кесарава сячэнне» была прызначаная на 8 снежня. Бацька Аксаны на гэты дзень замовіў у царкве малебен і папрасіў усіх сваякоў маліцца за яго дачку. На аперацыйным стале Аксане прыснілася маці. Яна суцяшала і падбадзёрвала, і дзякавала.

Праз гадзіну Уладзімір патэлефанаваў у Цэнтр, яму адказалі, што дзіця нарадзілася здаровае і самаадчуванне маці добрае.

— Гэта сапраўды — цуд, — не сумнявающца медыкі.

— Бачыце, — працягвае Аксана рукі, — у мяне і суставы ўсе ў норме, нічога не баліць, і адчуваю я сябе цудоўна. — Я нават бегаю ў восьмы корпус паглядзець на малога. Гэта даволі далёка па ўнутрыбальнічных пераходах. Я гляджу на яго і не магу налюбавацца!

Аксане, безумоўна, яшчэ неабходна лячэнне і назіранне, бо пасляродавы перыяд складаны для любой жанчыны, тым больш для яе. Увогуле ёй давядзецца цяпер змагацца за дваіх: за сябе і за малога. Дактары кажуць: пры строгім прытрымліванні ўсіх рэкамендацый, пры пастаяннай карэкцыроўцы лячэння, пры падтрымцы блізкіх людзей, яна, бясспрэчна, здолее вырасціць сына. Але самі Аксана і Уладзімір упэўненыя, што хвароба адступіць. Услед за адным цудам яны чакаюць другое. Я бачыла іх утраіх, у дзень, калі Уладзімір, Аксана і Ягорка, які здзівіў сваімі маленькімі памерамі бацьку, з'ядзжалі з Мінска ў Магілёў. Цяпер я не сумняваюся, што будзе так, як яны захочуць. Тое, што ёсць паміж гэтымі людзьмі, здольнае тварыць цуды.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Учора вядомы беларускі пісьменнік, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, партызан і франтавік Аляксандр Ануфрыевіч Савіцкі адзначыў 85-гадовы юбілей. Шчыра віншуем даўняга сябра і аўтара нашай газеты з гэтым прыгожым юбілеем! Зычым заўсёднай бадзёрасці, аптымізму, плёну ў творчасці — а гэта значыць, моцнага-моцнага здароўя.

«Звяздоўцы».

Алесь САВІЦКІ

ВЕЧНА ЖЫВЫ АГОНЬ

Эсэ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Звычайна прыцішыш хаду на мосце праз Свіслач, паглядзіш на спакойную плынь ракі, дзе зыркія мярэжкі святла электрычных ліхтароў кроюць на дрыготкія трохкутнікі няўтомныя качкі, а потым праз шырокі падземны пераход выходзіш па доўгіх прыступках на Плошчу. І ў той жа міг, як толькі ступіў на яе і ўбачыў трапяткія каснікі полымя, што мкнуцца ў вечаровае неба, адразу ж трапляеш пад абладу дзівоснай і магутнай энергетыкі гэтага невялічкага лапіка зямлі і адчуваеш, як дзівосна іначыцца ўся твая існасць: яснеціа ў галаве, чэзне і сплывае з душы дзённая тлумнасць, і няма стомы ў нагах, і сыходзіць на сэрца ўрачыстая лагода. І ты стаіш, адасобіўшыся ад бегу хвілін, ад шырокага няспыннага шлейфу аўтамабільнага святла, што высвечвае невысокі, амаль непрыкметны бардзюр, раздвойваецца, абціскае Плошчу і тут жа, адкінуўшы вузейшыя палосы святла ўлева і ўправа, зноў зліваецца ў адно, плыве ў бок плошчы Якуба Коласа, і гнуткія языкі полымя Вечнага Агню, бы нечыя клапатлівыя рукі, робяць яму добры знак на шчаслівую дарогу.

Нават у позні вечаровы час Плошча не бывае бязлюдная. Прыходзячы сюды, я, часцей за ўсё, бачу маладых хлопцаў і дзяўчат, прыкмячаю задуменнасць і павагу на тварах, асветленых трапяткім полымем; амаль заўсёды на блішчастых гранітных плітах ляжаць прыгожыя жывыя кветкі.

У перадапошнюю пятніцу мінулагодняга снежня я завітаў сюды са сваім сябрам, слынным беларускім паэтам Міколам Мятліцкім. Мы бралі ўдзел у пасяджэнні круглага стала па тэме «Літаратура і наша Армія», што праводзіла ў мінскім Доме афіцэраў ваенна-шэфская камісія Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гаворка цікавая, змястоўная, крыху зацягнулася, і патрэба ў праходцы па свежым паветры была аднолькавая ў абодвух, і мы не выбіралі маршрут, бо ён склаўся сам сабою.

На вуліцах ужо запаліліся ліхтары і падсветка будынкаў. Завіруха, што пранеслася над горадам пад канец дня, шчодра і прыгожа зацерушыла тратуары, абляпіла, бы бялюткай ватай, голле дрэў, і машыны, што імчалі праспектам, неслі на сабе зіхоткія снегавыя кучомкі.

Бела-белай, нібыта ў казцы, была і Плошча Перамогі. Толькі два ланцужкі слядоў цягнуліся ад верхніх прыступкаў падземнага пераходу да Вечнага Агню, і ля яго стаялі хлопец і дзяўчына. Угрэтыя граніт-ныя пліты пабліскивалі ад растала-га снегу, і на адной з іх ляжала чырвоная ружа з доўгім ціўем і шырокімі зялёнымі лісцінамі.

Вецер матляў полымя, і гул агняных струменяў, што выляталі з чыгуннага вянка ўглыбі гранітнага квадрата, зменьваўся, і зменьваўся колер ружы: яна то святлела, рабілася руковай, то набрыняла густымі барвамі. Гэткія ж водсветы агню трымцелі на маладых тварах, асабліва на твары дзяўчыны, якая стаяла, прытуліўшыся да пляча хлопца; хлопец быў мажны і высокі, у вязанай кепцы, зухавата пасунутай з чупрыны на лоб і зацярушанай снегам, і на гэтым белым пагорачку таксама міталіся агняныя крэскі.

Не ведаю чаму, але яе папытаў, ці не яны прынеслі сюды гэтую прыгожую ружу, спадзеючыся на станоўчы адказ. Але хлопец адмоўна хітнуў галавой. А дзяўчына сцішана прамовіла:

— Дзяўчаты тут былі да нас. Яны толькі што пайшлі. Вунька іх след на снезе...

Полымя выгнулася ў наш бок, у твар тхнула гарачынёю. У памяці ажылі радкі песні, якую я ўпершыню пачуў з шапіка на базары ў Піцундзе, дзе ішоў бойкі гандаль касетамі, што былі тады пад забаронаю. «А в Вечном огне вижу вспыхнувший танк, // Горящие русские хаты, // Горящий Смоленск и горящий рейхстаг, // Горящее сердце солдата».

Зноў закарцела даведацца, ці ведаюць закаханыя, хто напісаў гэтыя радкі. На жаль, не ведалі, і я адчуў непамыснасць: наладзіў, бач ты, нейкі экзамен на святым месцы. Ды іх жа — напэўна ж! — і на свеце яшчэ не было, калі песні Высоцкага бралі ў палон сэрцы мільёнаў.

Правёўшы Міколу да ўваходу ў метро, я не пакіраваў дамоў, а ўзняўся па прыступках на Плошчу, падпарадкоўваючыся неўсвядомленым парываннем папрасіць тых хлопца і дзяўчыну прабачыць мне залішнюю цікаўнасць.

Але іх на Плошчы ўжо не было. На тым месцы цяпер стаяла модна апранутая жанчына, і яна ўважна сачыла за хлопчыкам гадоў на пяць у чырвонай, спартыўнага крою куртачцы, які сіліўся дацягнуцца да прымацаванага да бакавіны помніка доўгага трохграннага мяча, спавітага пасярэдзіне лаўровай галінкаю і стужкай з металу. Прысыпаны снегам меч з вітой рукаяткаю, асветлены дрогкімі промнямі святла аўтамабільных фараў, выглядаў фантастычна, як бы сунуўся ў рукі хлопчыка. Але пастаўленыя наўскос мармуровыя пліты, на якія ў святочныя дні кладуцца рытуальныя вянкі і кветкі Памяці, былі гладкія, слізкія ад снегу і рабілі марнымі ўсе хлапчукоўскія высілкі.

— Андрэйка! Не трэба туды караскацца, — ласкава паклікала жанчына. — Ідзі сюды! Дамоў трэба ісці. Вячэра чакае!

Хлопчык нейкі час сядзеў панізу пастамента, зачараваны цяпер шлейфам святла аўтамабільных фараў, што ляцеў з боку Кастрычніцкай плошчы, потым ускочыў, патрос рукой, быццам вітаў гэты бясконцы і трапяткі шлейф святла. Адале ён гарэзна заскакаў па прыступках і падбег да маці. Ад новага парыву ветру полымя Вечнага Агню матлянулася яму насустрач, і гук агняных струменяў набыў прыгожае гучанне. Хлопчык нахіліўся, здзіўлены, і, паслухаўшы спеў агню, радасна выгукнуў:

— Агонь жывы! Ён спявае! Ты чуеш, мама?

— Чую, мой даражэнькі, чую. Але хадзем дамоў, — настойліва папрасіла хлопчыка маці.

— А чаму ён спявае? Пра што?

— Будзем вячэраць, Андрэйка, і наш дзядуля табе пра гэта раскажа. Ён жа быў на вайне і ўсё пра гэты агонь ведае...

Маці ўзяла хлопчыка за руку, і яны пайшлі. Ля ўваходу ў падземны пераход прыпыніліся, нейкі час глядзелі на Вечны Агонь. А я глядзеў на іх, незвычайна ўзрушаны і ўсцешаны. Не ведаю, як і што тлумачыў Андрэйку яго дзядуля. Але пераканаць і сёння: адкрыццё, зробленае хлопчыкам на вечаровай Плошчы — «Агонь жывы! Ён спявае!» — зіначыла яго дзіцячую душу, пакінула знак на ўсё жыццё. Бо хлопчык пачуў не проста спеў агню, а дзівосны голас, які не толькі здзівіў і завабіў, але і паклікаў у новы, шчэ неспазнаны свет.

Неўзабаве я таксама пайшоў з Плошчы. Ля ўваходу ў падземны пераход ступіў убок, каб не замінаць дзяўчыне і хлопцу, якія ўзніміліся па доўгіх прыступках, яшчэ не ачышчаных ад снегу. У правай руцэ дзяўчына трымала вялікую белую ружу.

Да Вечнага Агню яны пакіравалі не па добра ўжо ўтаптанай сцежцы, а павольна і спаважна прайшлі па цаліку ўсцяж каменных кубоў, на кожным з якіх напісаныя назвы Гарадоў-Герояў, пакідаючы роўны ланцужок слядоў на зырка-белай снегавой роўнядзі. Калі дзяўчына паклала ружу на блішчасты чырвоны граніт, полымя Вечнага Агню выгнулася ад парыву ветру, нахілілася над кветкай, нібыта прылашчыла новы дарунак маладых і добрых сэрцаў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.24	16.07	7.43
Віцебск —	8.21	15.52	7.31
Магілёў —	8.15	15.59	7.44
Гомель —	8.04	16.03	7.59
Брэст —	8.38	16.25	7.47
Гродна —	8.31	16.34	8.03

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Сцяпана, Фёдара.*
К. *Аліцыі, Тэрэзы, Андрыяна, Антоніі, Юльяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Геамагнітныя ўзрушэнні

Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — малая геамагнітная бура

...у суседзяў

ВАРШАВА -1..+1°C	КІЕЎ -3..-1°C	РЫГА -1..+1°C
ВІЛЬНЮС -4..-2°C	МАСКВА -14..-12°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ -6..-4°C

Усміхнёмся!

— І падабаюцца ж мне гэтыя дні нараджэння! Я ўчора быў у «Нацыяналі»: пяцьдзесят долараў з чалавека і — наогул нельга курыць!

— Гэта што, я ўчора быў у Сёмы: сто долараў з чалавека і — наогул нельга есці!

☺

Мужыкі, не будзьце дурнямі. Калі ваша жонка адчыняе вам дзверы з дурнаватай усмешкай, значыць, яна зрабіла новую стрыжку. Звярніце ўвагу і абавязкова пахваліце.

☺

На дзіцячай пляцоўцы жанчына абураецца:

— Маё дзіця з'ехала з горкі і ўрэзалася ў елку. Які дурань так горкі робіць?!

— Дык да елкі 200 метраў! — дзівіцца мінак.

— Ну і што?! А калі ў дзіцяці соплі?!

☺

Прафесар тлумачыць студэнтам:

«Маманты ў канцы ледніковага перыяду зніклі вельмі хутка, усё адно як у нас — пэйджары».

АБХОД ДВАРОЎ

Другі і наступныя дні Калядаў былі па сваім характары набліжаныя да святаў агульнародавай прымеркаванасці. З надыходам прыцемкаў збіралася некалькі гуртоў вясковай моладзі, пераапраналіся ў незвычайныя «строі», бралі з сабой казу і з піснямі-віншаваннямі абыходзілі па парадку ўсе вясковыя хаты.

● Лічылася вялікай непавагай і прадказаннем усялякіх бедаў, непаразуменняў і здарэнняў, калі нейкую сям'ю і гаспадарку па розных абставінах абміналі калядоўшчыкі. Такое здаралася вельмі рэдка, але ж здаралася.

● Праўда, было адно правіла-выключэнне, якое вымагала ад вясёлага, вірлівага гурта моладзі не наўмысна, а ў адпаведнасці з патрабаваннямі даўняй традыцыі «прапусціць», **абмінуць тую хату, якую ў гэтым годзе напаткала вялікае гора — смерць каго-небудзь з дамачадцаў.** Тая сям'я на працягу года несла на сабе знак жалобы.

● Абход дваро ў рабіла вясковая моладзь ва ўзросце 12-14 гадоў. Колькасць калядоўшчыкаў магла быць рознай: 5-7, 9, а ў некаторых выпадках нават 12 чалавек.

● Да выканання святочнага абрадавага дзеяння хлопцы рыхтаваліся загадзя. Ім трэба было развучыць даволі вялікія па сваіх памерах тэксты **абрадавых песень**, зрабіць прыгожую **калядную звязду**, набыць **свечкі**, **абразок**, падрыхтаваць саламяны куль, з якога выраблялі выяву казы або мядзведзя. Нарэшце, трэба было пераапрануцца ў **маскараднае адзенне**.

● Кожны з удзельнікаў хлапечага гурту выконваў сваю, абрадам прадугледжаную ролю. Узначальваў гурт павадыр (стары сівы дзядок), які вадзіў на павадку казу або казла. Выяву гэтай жывёліны рабілі наступным чынам. Выбіралі сярод прысутных самага жвавага, рухавага, здольнага на ўсялякія штукарствы хлопца, апраналі яго ў вывернуты кажух, падвязвалі куль саломы, сплятаці рогі, хвост, чаплялі званочкі. Задоўга да Калядаў хлопцы разам з дарослымі рабілі ляпу. Да дугі або якой-небудзь выгнутай палкі мацавалі выразаную з дрэва або сапраўдную галаву казы. Потым гэта прыстасаванне прасоўвалі пад кажух, хлопец схіляўся амаль да зямлі, і яго постаць нагадвала выяву добра знаёмай хатняй жывёлы.

● Казу вадзілі амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі. І гэта зусім не выпадкова. У старажытных міфалагічных уяўленнях каза была сімвалам пладавітасці, урадлівасці, дабрабыту сям'і.

Гурт калядоўшчыкаў заходзіў у двор і пачынаў спяваць песню:

Добры вечар таму, хто ў гэтым даму,
Святы вечар, хто ў гэтым даму.
Ці спіш, ці ляжыш, Гасподзь з табою,
Гасподзь з табою, гавары са мною.

Кожная сям'я чакала гэтага моманту, таму гаспадар хутка выходзіў на ганак і запрашаў незвычайных гасцей у хату. Гаспадыня спяшалася ў кладоўку і выносіла калядоўшчыкам розныя прысмакі: **кавалак саланіны, колца кілбасы, качан квашанай капусты, мочаныя яблыкі**. Маглі таксама адарыць і якой-небудзь смажанінай.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дзве даты

9 студзеня

1897 год — пачаўся 1-ы Усерасійскі перапіс насельніцтва. Паводле яго звестак, на тэрыторыі тагачаснай Беларусі пражывала 6 899 000 чалавек. З іх у Мінску — 90 912, Гродне — 46 900, Гомелі — 36 800, Брэсце — 46 560, Магілёве — 43 119, Віцебску — 65 900.

1799 год — у Англіі ўпершыню ў свеце быў уведзены падаходны падатак.

Цытата дня:

«Смелыя думкі выконваюць ролю перадавых шашак у гульні: яны гінуць, але забяспечваюць агульную перамогу».

Іаган Вольфганг Гётэ (1749-1832), нямецкі пісьменнік.

Фота слова

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

Бываюць імгненні, калі чалавек нібы зліваецца ў адно з усім навакольным, але ад гэтага сам не знікае, наадварот, становіцца больш прыкметным, больш зразумелымі становяцца яго думкі...

Гэты здымак зроблены ў час творчага вечара пісьменніка і гісторыка Анатоля Бутэвіча, калі на кінаэкране ў кадрах далёкай хронікі ўзнік твар яго бацькі...

— Ты чуеш, бацька,
падаюць сняжыны —
Марыін покрыў
на грахі Зямлі.
Ці ёсць ў тваёй
завоблачнай краіне
Такія ранкі светлыя —
калі,
Як ступіш за парог,
то захлынешся
Ад светлай,
свята-снежнай цішыні...

Як чуеш —
то здалёку адзавешся:
Скажы мне,
як пражыць на быстрыні,
Каб хваля не занесла
на чужыні,
Каб не змарнецца
на задушным дне...
— Ты чуеш, бацька,
ўкруг нямота стыне
І светлы снег,
як у дзіцячым сне.



ПАНЯДЗЕЛАК, 12 СТУДЗЕНЯ

5.30 Дак. серыял «Таямнічы свет жывёл».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.45 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце мараў.
9.05, 15.25 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Nota Bene.
9.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Сямейныя традыцыі».
11.00, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
12.10 Дак. фільм «Мас-фільм». Невядомая версія».
12.40 Камедыя «Верныя сябры».
14.30 «Будні чэмпіёнаў». Андрэй Краўчанка.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
16.50 Серыял «Гарачы лёд».
19.35 «Арэна».
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50, 1.45 Серыял «Доктар Хаўс».
22.55 Баявік «Прывід у глыбіні».
0.50 Дзень спорту.
1.05 Хакей для ўсіх.
2.30 Усе стыхіі.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 0.00, 1.20 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 Тэорыя неверагоднасці. «Антыхілер».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0.15, 1.35 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
11.50 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.50 «Модны прыгавор».
15.00 Серыял «Шырокая рака».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
18.55 Серыял «Рыжая».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
21.30 Мюзікл «Батлейка».
0.20 «Прафесійны бокс. Андрэ Берта-Сціў Форбс».

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 17.00 Смачна з Барысам Бурдой.
8.15 Тэлебарометр.
8.35 Усё аб бяспецы.
9.00 У гэты дзень.
9.05, 16.10 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
9.50, 17.35 Серыял «Спадчынніца».
10.50 Камедыя «Лулу назаўсёды».
12.30 Слова пісьменніка.
13.00 Серыял «Расплата за грахі».
13.50 Бухта капітанаў.
14.30 Мультфільм.
14.50 Мультсерыял «Соннік Ікс».
15.10 Пазакласная гадзіна.
15.20 Гіпноз.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Забойная сіла-2».
19.50 Беларуская часінка.
20.45 Калыханка.
21.05 Меладрама «Безыменная зорка». 1-я серыя.
22.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
23.20 Хакей. Формула гульні.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае снеданне».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.50 Серыял «Жыццё працягваецца».
11.45, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».
12.35 «Ваенная тайна».
13.50 «Мой дом».
14.20 «Наша справа».
14.30 «Фантастычныя гісторыі».
15.30 «Я — вандроўнік».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ—спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.35 Камедыя «Перакладчыца».
23.00 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
0.00 «Закон і крымінал».
0.05 «Гучная справа».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05, 2.30 Садружнасць live.
5.30 «Жаночы часопіс».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.30 «Агульны інтэрэс».
8.05, 1.30 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05, 20.05 «Слова за слова».
10.05 Серыял «Сям'я Серано».
11.05 Серыял «Прыгоды мага».
12.05, 23.45 Маст. фільм «Падарункі па тэлефоне».
14.05 Мультсерыял «Блізняты Крамп».
14.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».
15.20 Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 Акцэнты.
18.30 Серыял «Дзеці Ванюхіна».
21.20, 3.00 Серыял «Сезон палявання-2».
22.30 «Тэатр пачынаецца».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.50, 16.55 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 23.35 «Метэапрагноз».
7.30 Камедыя «Высокі бландзін у чорным чаравіку».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
11.00 Серыял «Сям'я Кардзье».
12.45 «8 самых».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Свабольнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
19.45 Серыял «Усход—Захад-101».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.05 Трылер «Матрыца».
23.15 «Стары магнітафон».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.20 Пакой смеху.
10.30 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30 Камедыя «Труфальдзіна з Бергама».
13.50, 16.50, 18.50, 23.20 Навіны—Беларусь.
14.20 «Святлана Алілуева і яе мужчыны». Дак. фільм.
15.15, 22.30 «Кулагін і партнёры».
15.50 Суд ідзе.
17.25 «Гарадок». Дайджэст.
17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.35 Серыял «Кармеліта».
20.30 Серыял «І падае снег...».
21.30 Серыял «Пастка».
23.00 Весткі+.
23.30 «Забаронены абгон. Генадзь Бачынскі». Дак. фільм.

7.00 Добрай раніцы, Расія!
10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Родныя людзі».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».
11.30 Маст. фільм «Рассмяшыць Бога».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Камедыя «Стары Новы год». 1-я серыя.
14.40 Мультфільмы.
15.15 «Святлана Алілуева і яе мужчыны».
16.30 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.50, 0.10, 6.40 Весткі-спорт.
17.00, 5.40 «Пісьменнікі нашага дзяцінства». Леанід Панцялееў.
19.45, 1.55 Серыял «Кармеліта».
20.30, 3.40 Серыял «Калі ў вас няма цёткі...».
21.20, 4.50 «Мой сярэбраны шар. Іна Ульянава».
22.05 Весткі—Санкт-Пецярбург.
22.20 «Легенды і былі дзядзькі Гіляя».
23.00, 4.30 Весткі+.
23.20, 2.40 Навіны культуры.
23.40, 6.10 «Начны палёт».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.05 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
9.20 «Шчырае прызнанне».
10.25 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.10 Суд прысяжных.
13.35 Серыял «Тузін правасуддзя».
15.05 «Прафесія — рэпарцёр».
15.30, 18.30, 22.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
19.30 Серыял «Павуціна».
21.35 «Следства вялі...».
23.25 «Ты смешны!».
0.10 Серыял «Медыум».
1.35 «Школа зласлоўя».

7.15 Канал «Настрой».
9.25 «Энцыклапедыя». Французская Пісаро.
9.30, 18.30, 3.15 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.15, 19.15, 7.00 «Прыгоды капітана Врунгеля». Мультфільм.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 0.45 Падзеі.
10.45, 1.15 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
10.50 Маст. фільм «Яна вас кахае».
12.15, 3.55 Дак. фільм «Масква Першапрастольная».
12.45, 20.05 Серыял «Анёл-ахоўнік».
13.45 «Пятроўка, 38».
14.00, 20.50 «Лінія абароны».
14.35 «Мазгавы штурм».
15.00, 6.15 Серыял «Жонка Іуды».
15.50 «Геній Места».
16.15, 21.25 «Рэпарцёр».
16.50, 2.00 Серыял «Інспектар Дэрык».
17.50 «Тыгр скача двойчы». Фільм Леаніда Млечына.
21.45, 4.25 Серыял «Залатое цяля».
22.30 Момант ісціны.
23.10 Маст. фільм «Спячы і прыгажуня».
0.45 Падзеі. 25-я гадзіна.
1.20 «Нічога асабістага». Новы рускі шык.
3.00 «Траццякоўская галерэя». Спецыяльны рэпартаж.
5.10 «Pop Corn-TV».
5.35 «Нацыянальны набытак». Уладзімір Этуш.

9.30, 20.15, 0.00, 1.45 Ралі рэйд. Дакар.
10.15 Агляд снежнага ўік-энда.
10.45 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету.
11.30 Біятлон. Кубак свету.
13.00, 19.45, 22.00, 0.45 Снукер.
19.00, 20.30, 1.00 Футбол. Еўрагалы.
21.00 Футбол. Цырымонія ўзнагароджання лепшага гульца па версіі ФІФА.

21.05 ФІЛЬМ ДНЯ

«МАТРЫЦА» (ЗША, 1999 г.)

Свет Матрыцы — гэта ілюзія, якая існуе толькі ў бясконцым сне асуджанага чалавецтва. Халодны свет будучыні, у якім людзі — усяго толькі батарэйкі ў камп'ютарных сістэмах.

Рэжысёры — Эндзі Вачоўскі, Лары Вачоўскі. **У ролях:** Кіяну Рыўз, Лоўрэнс Фішбарн, Кэры-Эн Мос, Х'юга Уівінг, Глорыя Фостэр.

НТБ пайшоў на канікулы

У сувязі з гэтым у студзені шэраг праектаў на тэлеканале «НТБ-Беларусь» будзе адсунутнічаць — ток-шоу «Да бар'ера!», конкурс «Суперстар», дакументальны праект «І зноў прывітанне». Праграма «Следства вялі» будзе выходзіць у паўторах.

Акрамя таго, на праграме перадач адбіўся і фінансавы крызіс: тэлеканал НТБ (Масква) спыніў вытворчасць праграм «Усё адразу», «Пакой адпачынку», «Дас іст фантасціш», «Залатая вутка», «Наша тэма». Апошнія выпускі выйдуць у эфір у студзені.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

АЎТОРАК, 13 СТУДЗЕНЯ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.02, 7.05 Прэс-агляд.
6.05, 1.15 Дзень спорту.
6.15, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 1.10 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Арэна.
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Монтэкрыста».
10.05, 16.45 Серыял «Гарачы лёд».
